САМАЯ ПОЎНАЯ ТЭЛЕПРАГРАМА НА ТЫДЗЕНЬ: 31 КАНАЛ

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

2 СНЕЖНЯ 2011 г.
ПЯТНІЦА
№ 230
(27094)

Кошт 800 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«БЕЗ БЕЛАРУСІ НЕ МОЖА БЫЦЬ НІ АЭП, НІ МЫТНАГА САЮЗА»

Без Беларусі не можа быць ні Адзінай эканамічнай прасторы, ні Мытнага саюза, які створаны на тэрыторыі Беларусі, Расіі, Казахстана. Аб гэтым у ходзе рабочай сустрэчы з адказным сакратаром Камісіі Мытнага саюза Сяргеем Глазьевым заявіў кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Пачынаючы сустрэчу, Прэзідэнт адзначыў, што пытанні, якія ён хацеў бы абмеркаваць з Сяргеем Глазьевым, звязаны з фарміраванням Адзінай эканамічнай прасторы. «Мы калісьці дамаўляліся з вамі, што праз год-два вы мне сумленна і прынцыпова выкажаце свой пункт гледжання, што ў нас атрымалася, што можа атрымацца, што не атрымалася на сёння і на што Беларусі варта звярнуць асаблівую ўвагу», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Па-другое, вы цудоўна разумееце, што без Беларусі не можа быць ні АЭП, ні Мытнага саюза, у якім мы цяпер знаходзімся. Таму вы, як чалавек, які практычна стаяў разам з іншымі ля вытокаў фарміравання гэтага працэсу, будзеце абсалютна шчырыя, паколькі зацікаўлены ў поспеху», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Па-трэцяе, што тут граху таіць, Беларусь — гэта будзе асаблівая краіна ў АЭП. Таму што ў яе эканоміка не такая, як у Расіі і Казахстана. Там больш прыродных рэсурсаў, там яны больш моцныя з пункту гледжання вуглевадародаў, а гэта сёння ў многім вызначае эканоміку, развіццё, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. — Таму, вядома ж, Беларусі трэба мець на ўвазе некаторыя аспекты, аб якіх вы мне можаце сказаць і параіць, у якім плане дзейнічаць».

Кіраўнік дзяржавы таксама адзначыў, што хацеў бы параіцца з Сяргеем Глазьевым і па шэрагу кадравых пытанняў, у тым, што датычыцца стварэння Еўразійскай эканамічнай камісіі і яе рабочых органаў — савета і калегіі, якія пачнуць працаваць з 1 студзеня 2012 года. «Якія патрабаванні да гэтых людзей, таму што мы будзем пасылаць туды шэраг сваіх работнікаў? Гэта для мяне таксама вельмі важна», — пацікавіўся Прэзідэнт.

У сваю чаргу Сяргей Глазьеў адзначыў, што практычна ўвесь план дзеянняў, які быў у 2007 годзе вызначаны кіраўнікамі дзяржаў па стварэнні Мытнага саюза, сёння поўнасцю выкананы. Выкананы этапы і тэрміны фарміравання адзінай мытнай тэрыторыі і план дзеянняў па ўвядзенні Мытнага кодэкса.

САД НА АЗЁРНАЙ ЗЯМЛІ

САДАВОДЫ краіны, да ліку якіх адносіцца і фермер з Ушацкага раёна Юрый Нічыпар, хвалююцца, каб сёлетняя зімовая цеплыня не паспрыяла несвоечасовай вегетацыі. З'яўленне пупышак напярэдадні маразоў можа прывесці да пашкоджання і пладаносных, і маладых дрэўцаў. Сёлета ўшацкі фермер заклаў два гектары яблынь беларускіх гатункаў, пераважна зімовых, — «Імрус», «Весяліна», «Беларускае салодкае», «Памяці Субаравай». Праз пару гадкоў чакае добрыя ўраджаі. Дагэтуль займаўся яблыневым гадавальнікам і прышчэпкамі, прамысловым вырошчваннем чорнай парэчкі.

— На беларускай зямлі павінны выспяваць яблыкі сваіх, беларускіх гатункаў. Бо нашыя ні ў чым не саступаюць замежным — гэткія ж сакавітыя, прыгожыя, добра захоўваюць таварны выгляд. І да таго ж на любы смак, — кажа Юрый Нічыпар, аглядаючы перадзімовы першынец-сад, у якім і дагэтуль хапае клопатаў і турбот.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«Прамая лінія»

ІНДЫВІДУАЛЬНАЕ БУДАЎНІЦТВА БУДЗЕ ВЕСЦІСЯ ПА НОВЫХ УМОВАХ

Па якім дакладным алгарытме пасля новага года трэба будзе ажыццяўляць кансервацыю незавершанага індывідуальнага будаўніцтва? За які час прыватныя забудоўшчыкі павінны пабудаваць сваё жыллё і ці магчыма павялічыць тэрмін будаўніцтва індывідуальных дамоў? Што новага прадугледжвае заканадаўства пры выдзяленні і адбіранні зямельных участкаў з першых дзён 2012 года?

6 снежня, у аўторак, **з 11.00 да 12.00** у рэдакцыі нашай газеты адбудзецца «прамая лінія» з удзелам **намесніка старшыні Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі Андрэя Анатольевіча ГАЕВА**.

Нумары «прамой лініі»: 8(0172) 292 38 92; 8(017) 292 38 21. Папярэднія пытанні можна задаваць па нумары: 8(017) 287 17 51 з 10.00 да 15.00, або дасылаць на электронны адрас zvyazda@tyt.by.

Павіншуйце
Вашых партнёраў
з Новым годам і Калядамі!
Сэрвіс друку
НАВАГОДНІХ
фірменных ПАШТОВАК
InterPrint.by
офіс (017) 298 41 68
МТС (029) 775 57 18
ООО «ТЦ СНАМІ» УНП 100705382
Мабільныя тэлефоны SNAMI® SNAMI.BY

ДЗЯРЖАВА І Ў ДАЛЕЙШЫМ БУДЗЕ ПАДТРЫМЛІВАЦЬ ТАЛЕНАВІТУЮ ТВОРЧУЮ МОЛАДЗЬ

Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўчора на сустрэчы з прадстаўнікамі творчай моладзі, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

«Калі ты таленавіты, настойлівы, адданы сваёй мары, то абавязкова даб'ешся поспеху. Мы і ў далейшым такіх людзей не пакінем без падтрымкі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Адкрываючы сустрэчу, кіраўнік дзяржавы нагадаў, што паўтара дзясятка гадоў таму, калі ствараўся фонд Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі, сёй-той сумняваўся, ці будзе ад гэтага толк. «І сёння, гледзячы на вас, можна сказаць, што сродкі, укладзеныя ў самы дарагі здабытак — розум і талент — не прапалі дарма, — адзначыў беларускі лідар. — Лаўрэатамі і стыпендыятамі фонду сталі амаль 2 тыс. маладых людзей. Мы выгадавалі новае пакаленне творчай інтэлігенцыі, тых, каму можна даверыць прымнажэнне патэнцыялу айчыннай культуры».

Стварыць умовы для прафесійнага станаўлення адораных асоб, павысіць іх сацыяльную абароненасць таксама дала магчымасць рэалізацыя дзяржпраграмы «Маладыя таленты Беларусі» на 2006—2010 гады.

«Выхаванне талентаў — справа не энтузіястаў-адзіночак, а адзін з важнейшых напрамкаў сацыяльнай палітыкі. У Беларусі створана цэлая інфраструктура работы з адоранымі дзецьмі і моладдзю», — адзначыў Прэзідэнт. Гэта інфраструктура ўключае больш за 100 дашкольных развіваючых цэнтраў, 29 ліцэяў, 215 гімназій, сотні пазашкольных устаноў, а таксама дзясяткі тысяч аб'яднанняў па інтарэсах.

Фота БЕЛТА.

Аляксандр Лукашэнка прывёў як прыклад змену арыенціраў улады, якая адбылася за апошнія дзесяцігоддзі. «І гэтым самым нашым «творчым дзеячам» давялося некалькі разоў за жыццё «перафарбоўвацца». То яны свята верылі ў камунізм і падтрымлівалі камуністычную ідэю. Потым яны хутка пераарыентаваліся на новыя ідэі», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Я катэгарычна супраць гэтага (падстройвання інтэлігенцыі пад уладу. — **Заўвага БЕЛТА**), і вы ніколі мяне не зможаце папракнуць, не знойдзеце для гэтага падстаў, — сказаў Прэзідэнт. — Мае партрэты нідзе, акрамя чыноўніцкіх кабінетаў, не вісяць. Кажуць, так трэба, хоць я вельмі дрэнна гэта ўспрымаю. Гэта адзінае, дзе я згадзіўся і адступіў ад сваіх патрабаванняў».

«Стварайце ў інтарэсах свайго народа, дзе б вы ні былі, — заклікаў Аляксандр Лукашэнка. — Каб пасля не было балюча і крыўдна, памятайце пра свой кавалак зямлі, нават калі вы будзеце зарабляць грошы ў іншай краіне. Памятайце, адкуль вашы карані. Не сварыцеся са сваёй краінай, з яе прынцыпамі і ідэаламі, якімі жыве ваша краіна, якімі яны ні былі б».

Аляксандр Лукашэнка заклікаў творчую моладзь шукаць сваё месца ў мастацтве, пры гэтым не баючыся эксперыментаў, захоўваючы вернасць гуманістычным ідэалам. «Чэрпайце натхненне з чыстай крыніцы — з беларускай прыроды, нашай гераічнай гісторыі, жыцця сучаснай Беларусі і, самае галоўнае, — з моцнага характару і мудрасці народа», — дадаў ён.

Як адзначыў кіраўнік дзяржавы, многія гаворваць, што хацелі б жыць, як у Еўропе. «Нядрэнна, тады давядзецца навучыцца працаваць па-еўрапейску, дзе складальнікамі поспеху з'яўляюцца як мастацкія вартасці твораў, так і правільны менеджмент. А вось з гэтым аспектам у нас яшчэ далёка не ўсё на належным узроўні».

«Таму лічу, што нам трэба ствараць неабходныя ўмовы для развіцця дзяржаўна-прыватнага партнёрства, спонсарства і мецэнацтва.

Фота БЕЛТА.

«У нашай краіне захавана і паспяхова развіваецца цэласная сістэма мастацкай адукацыі, пачынаючы ад дзіцячых школ мастацтваў і заканчваючы ВНУ культуры. Сфарміраваны нацыянальныя творчыя школы. Доступ да гэтага духоўнага багацця мае любое адоранае дзіця», — сказаў Прэзідэнт.

Разам з тым кіраўнік дзяржавы перасцярог творчую моладзь ад утрыманскіх настрояў. «Сёння ў культуры акрамя творчых здольнасцяў яшчэ патрэбна ініцыятыва, энергія і прадпрымальнасць», — падкрэсліў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліваў, што ніколі не патрабаваў ад прадстаўнікоў творчай інтэлігенцыі ствараць творы, каб дагадзіць уладзе.

«Гэта норма, канцэптуальная аснова маёй палітыкі як Прэзідэнта. Я ніколі інтэлігенцыю, перш за ўсё творчую, пісьменнікаў, мастакоў, не арыентаваў на тое, каб яны пісалі, каб дагадзіць уладзе. Лічу, што калі нехта звяртаецца да інтэлігенцыі з такой просьбай, ён проста яе зневажае».

На думку кіраўніка дзяржавы, нельга стаць мастаком з вялікай літары, калі не мець уяўлення пра галоўнае: дзеля чаго ты ствараеш, які сацыяльны і маральны зарад нясуць твае творы. «Беларуская культура заснавана на ідэалах патрыятызму, вернасці жыццёвай праўдзе, любові да чалавека і служэння дабру. Гэта спадчына павінна стаць для нас крыніцай духоўнай сілы».

«На жаль, сёння мастацтва стала паступова страчваць маральныя арыенціры. Нехта кідаецца на прынаду нізкапробнай масавай культуры, смакуе амаральныя ўчынкі і нават злачынствы, называючы гэта «новым словам у мастацтве».

«Яшчэ больш непрыглядныміз'яўляюцца спробы некаторых «незалежных творчых дзеячаў», а калі быць больш дакладным, дзялкоў ад культуры, змешваць мастацтва з палітыкай, дабівацца таннай папулярнасці, зневажаючы ўласную краіну і народ. Веру, што ніхто з вас ніколі не адмовіцца ад сумлення», — сказаў Прэзідэнт.

Прафсаюзная трыбуна

ПАМЕРЫ ЗАРОБКАЎ У АДУКАЦЫЙНАЙ ГАЛІНЕ ПАКУЛЬ АДСТАЮЦЬ АД ІНФЛЯЦЫЙНЫХ ПРАЦЭСАЎ

Сацыяльна-эканамічнае становішча работнікаў і ветэранаў працы адукацыйнай галіны аказалася ў цэнтры ўвагі ўдзельнікаў чарговага пасяджэння Прэзідыума Цэнтральнага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі. Удзел у пасяджэнні ўзяў намеснік міністра адукацыі Казімір Фарыно, якому давялося адказваць на шматлікія пытанні прысутных.

— У пачатку гэтага года ў нашай краіне абвастрыўся шэраг эканамічных і фінансавых праблем. Інфляцыя, дэвальвацыя і дэфіцыт валюты прывялі да значнага зніжэння ўзроўню жыцця работнікаў сістэмы адукацыі, — падкрэсліла ў сваім выступленні **загадчык аддзела сацыяльна-эканамічнай работы ЦК прафсаюза Валянціна ГЕРАСІМОВІЧ**. — Па звестках Нацыянальнага статыстычнага камітэта, у студзені—кастрычніку 2011 года рост валавога ўнутранага прадукту ў параўнанні з аналагічным леташнім перыядам склаў у супастаўных цэнах 7,0 працэнта. Індэкс прамысловай вытворчасці да ўзроўню аналагічнага перыяду 2010 года склаў 110,0 працэнта. Тым не менш, сярэднямесячная заработная плата ў адукацыі за 10 месяцаў гэтага года склала толькі 1405,9 тыс. рублёў або 312 долараў (да выхаду ў кастрычніку на адзіны курс валюты разлікі праводзіліся па курсе Нацыянальнага банка). Для параўнання: у снежні 2010 года яе памер складаў 1298,4 тыс. рублёў (або 427 долараў). Гэта значыць, што пры высокіх паказчыках росту валавога ўнутранага прадукту памер заработнай платы ў адукацыі значна адстае ад інфляцыйных працэсаў.

Суадносіны заработнай платы ў галіне адукацыі да аналагічнага паказчыка ў прамысловасці складаюць 71,1 працэнта, у тым ліку ў педпрактыкаў — 77,4 працэнта, у настаўнікаў — 82,9 працэнта, прафесарска-выкладчыцкага саставу — 122,4 працэнта. Сярэдняя заработная плата ў прамысловасці за 10 месяцаў 2011 года склала 1977,5 тыс. рублёў.

Валянціна Герасімовіч звярнула ўвагу на дыспрапорцыю ва ўзроўнях аплаты працы работнікаў адукацыі і аховы здароўя і падмацавала сваю думку канкрэтнымі лічбамі. За 10 месяцаў гэтага года сярэдняя заработная плата настаўнікаў склала 1639,0 тыс. рублёў, а прафесарска-выкладчыцкага саставу — 2419,8 тыс. рублёў. Ва ўрачоў сярэдняя зарплата была 2472,3 тыс. рублёў, а ў сярэдняга медыцынскага персаналу — 1452,0 тыс. рублёў. Такім чынам сярэднямесячная заработная плата ўрачоў перавышала заробкі і настаўнікаў (на 51 працэнт!), і нават прафесарска-выкладчыцкага саставу (на 2,2 працэнта)

Пра тое, як пагаршалася сацыяльнае становішча работнікаў галіны, сведчаць і наступныя факты. Індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі ў верасні 2011 года ў параўнанні са снежнем 2010 года склаў 174,5 працэнта, а ў кастрычніку — 189 працэнтаў. Значыць, цэны выраслі з пачатку года на 89 працэнтаў. Кошт мінімальнага набору прадуктаў харчавання ў верасні гэтага года павялічыўся ў 1,8 раза ў параўнанні са снежнем папярэдняга года.

Савету Міністраў даручана разгледзець у 2012 годзе пытанні паэтапнага павышэння заработнай аплаты педагагічным работнікам дашкольнай і агульнай сярэдняй адукацыі пры адначасовым удасканаленні сістэмы аплаты іх працы.

У прафсаюзе канстатуюць, што ўрадам рабіліся пэўныя крокі для паляпшэння сацыяльнага дабрабыту насельніцтва: праводзілася індэксацыя даходаў, павялічваўся памер мінімальнай заработнай платы, з 1 кастрычніка быў павялічаны памер тарыфнай стаўкі першага разраду. У выніку намінальная заработная плата работнікаў адукацыйнай галіны выраслa ў сярэднім на 28 працэнтаў. Акрамя таго, з 1 лістапада былі ўведзены штомесячныя дыферэнцыяваныя дапаматы ў дыяпазоне ад 16 да 240 тысяч рублёў. Гэта дазволіць павялічыць заработную плату яшчэ ў сярэднім на 13 працэнтаў.

— Разам з тым, такія меры ўсё роўна не пакрыюць інфляцыйныя працэсы, што немінуча адаб'ецца на зніжэнні пакупніцкай здольнасці работнікаў адукацыі, — падкрэсліла Валянціна Герасімовіч. — У кастрычніку адбылося чарговае пасяджэнне Нацыянальнага Савета па працоўных і сацыяльных пытаннях. На ім прадстаўнікі Федэрацыі прафсаюзаў спрабавалі даведацца ў прадстаўнікоў урада, якія канкрэтна крокі будуць рабіцца для стабілізацыі эканамічнай сітуацыі ў краіне. Усе прызнавалі, што сітуацыя ў эканоміцы краіны склалася вельмі напружаная і няпростая. Аднак шырокі аналіз быў зведзены да таго, што ўраду трэба будзе ажыццявіць яшчэ шмат работы, каб выканаць сацыяльныя абавязкі дзяржавы перад насельніцтвам.

Надзвычай востра паўстала ў апошнія гады і праблема катастрафічнага зніжэння ў грамадстве прэстыжу прафесіі настаўніка. Таму нядзіўна, што па выніках прыёмнай кампаніі 2011 года месцы на некаторых педагагічных спецыяльнасцях засталіся незапоўненыя. У жніўні на рэспубліканскай нарадзе педагагічнага актыву Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што асноўнымі задачамі, якія стаяць перад галіной, з'яўляюцца павышэнне якасці адукацыі, абнаўленне яе зместу на аснове сучасных навуковых ведаў і рост эфектыўнасці работы вучэбных устаноў і кожнага канкрэтнага педагога. Выкананне гэтых задач у значнай ступені залежыць ад кваліфікацыі і прафесійнага майстэрства педагогаў, чалавечых і прафесійных якасцяў кожнага з іх. **Аднак рэалізаваць свае патэнцыяльныя магчымасці ў поўнай ступені педагогі могуць толькі ў тым выпадку, калі яны займаюць становішча, якое адпавядае іх ролі ў грамадстве, калі іх правы належным чынам абаронены. Прэзідэнт выказаў упэўненасць, што пры любых змяненнях у сістэме адукацыі роля настаўніка заўсёды будзе галоўнай і вызначальнай. Дзяржава гатова падтрымаць настаўнікаў, выкладчыкаў і выхавальнікаў не толькі маральна, але і матэрыяльна, гатова ўзмацніць сацыяльны пакет, але пры ўмове рэзкага павышэння аддачы ад іх работы.**

Па выніках нарады з педагагічным актывам Савету Міністраў было даручана ў 2012 годзе разгледзець пытанні паэтапнага павышэння заработнай аплаты педагагічным работнікам дашкольнай і агульнай сярэдняй адукацыі пры адначасовым удасканаленні сістэмы аплаты іх працы. Зараз у Міністэрстве адукацыі створана рабочая група па рэалізацыі вышэйназванага пункта даручэння, якую ўзначаліў намеснік міністра адукацыі Казімір Фарыно. Акрамя работнікаў міністэрства, у камісію ўвайшлі прадстаўнікі Нацыянальнага інстытута адукацыі, Акадэміі паслядыпломнай адукацыі, упраўленняў адукацыі, агульных сярэдніх навучальных устаноў. Пазіцыю Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі ў гэтай камісіі будзе прадстаўляць намеснік старшыні Цэнтральнага камітэта Раман Дапіра.

Старшыня пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі работнікаў БНТУ Валерый СМЁТКІН узняў яшчэ адну актуальную для многіх вышэйшых навучальных устаноў праблему, якая асабліва абвастрылася сёлета — адток выкладчыцкіх кадраў. На яго думку, паказчык сярэдняй заработнай платы прафесарска-выкладчыцкага саставу не з'яўляецца аб'ектыўным і не адлюстроўвае рэальныя даходы выкладчыкаў у сувязі з вялікай колькасцю ў вышэйшых навучальных установах сумяшчальнікаў, а таксама вымушанай перарацоўкай з-за недахопу кадраў і нізкіх заробкаў, якія прымушаюць выкладчыкаў браць на сябе дадатковую нагрузку. Акрамя таго, сярэдні паказчык не адлюстроўвае рэальныя даходы радавых і старшых выкладчыкаў, асабліва маладых. Між іншым, колькасць асоб з прафесарска-выкладчыцкага саставу, да якіх не прад'яўляюцца патрабаванні па наяўнасці вучонай ступені і вучонага звання перавышае 12 тысяч чалавек, а гэта, між іншым, 53 працэнты ад агульнай колькасці прафесарска-выкладчыцкага саставу. Даводзіцца канстатаваць, што таленавітая моладзь не лічыць прыцягальным варыянтам працаўладкаванне на выкладчыцкую работу. Больш за тое, менавіта маладыя людзі ва ўзросце да 30 гадоў часцей за іншых пакідаюць выкладчыцкую работу і шукаюць сабе прымяненне ў іншых сферах.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ЗАЎТРА — ФІНАЛ КОНКУРСУ ПЕСНІ «ДЗІЦЯЧАЕ ЕЎРАБАЧАННЕ-2011»

3 снежня ў 21:30 на тэлеканалах «Беларусь-1» і спадарожнікавым канале «Беларусь-ТВ» пройдзе прамая трансляцыя дзявятага міжнароднага дзіцячага конкурсу песні «Еўрабачанне-2011» з Ерэвана (Арменія).

Беларуска Лідзія Заблоцкая выступіць пад дзясятым нумарам. За дзень да фіналу «Звязда» дазванілася ў Ерэван і пагутарыла з выканаўчым прадзюсарам Белтэлерадыёкампаніі Людмілай Барадзіной, якая ўзначальвае беларускую дэлегацыю.

— Рэпетыцыі прайшлі вельмі ўдала. Аператарская праца прыемна парадавала: тэлекамера любіць нашу выканаўцу. У нумары мы нічога не мянялі, але ўнеслі пэўныя прапановы рэжысёрска-пастановачнай групе, каб яшчэ лепш падкарэктаваць карцінку ў кадры. Увогуле, заўваг не было, былі толькі пажаданні *(усміхаецца. — Аўт.)*. Прыемна радуе вельмі цёплая і добразычлівая атмасфера на конкурсе. Нашы дзеці пасябравалі з канкурсантамі з Грузіі, Бельгіі, Расіі, Украіны, Галандыі.

Фота БЕЛТА.

Паводле слоў Людмілы Барадзінай, цікавай была і прапанаваная арганізатарамі культурная праграма. Удзельнікі «Дзіцячага Еўрабачання» наведалі музей старажытных рукапісаў.

Тым часам на прэс-канферэнцыі ў Ерэване **дырэктар Дзіцячага конкурсу песні «Еўрабачанне» Сітсэ БАКЕР** зазначыў, што «Дзіцячае Еўрабачанне» атрымае працяг.

— Мы хочам, каб гэты конкурс працягваўся. Для дзяцей гэта цудоўная магчымасць прадэманстраваць свой талент, тым больш што мы — дарослыя — верым у гэты талент.

У наступным годзе конкурс пройдзе ў Нідэрландах. Пра тое, у якім горадзе будзе арганізаваны конкурс, стане вядома пасля Новага года.

Для беларускіх гледачоў прамую трансляцыю з Ерэвана будзе каментаваць Дзяніс Кур'ян, балы ад Беларусі аб'явіць вучаніца 8-га класа Мінскай лінгвістычнай гімназіі-каледжа № 24 Ганна Кавалёва.

Ілья ЛАПАТО.

ДАЗВОЛЫ НА СПРОШЧАНЫ ПАРАДАК ПЕРАСЯЧЭННЯ МЯЖЫ БЕЛАРУСІ І ЛАТВІІ ПАЧНУЦЬ ВЫДАВАЦЬ З 1 ЛЮТАГА 2012 ГОДА

Аб гэтым паведаміў журналістам **начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў Андрэй САВІНЫХ,** перадае **БЕЛТА**.

«Абмен пісьмовымі паведамленнямі дасць магчымасць з 1 снежня пачаць фарміраванне спісаў жыхароў прыгранічных тэрыторый, якія маюць права на атрыманне адпаведных дазволаў. Непасрэдна выдача дазволаў у генеральным консульстве Беларусі ў Даўгаўпілсе і консульстве Латвіі ў Віцебску пачнецца з 1 лютага 2012 года», — сказаў Андрэй Савіных. Тэрмін падрыхтоўкі спісаў складае два месяцы.

Як адзначыў прэс-сакратар МЗС, рэалізацыя пагаднення акажа пазітыўны ўплыў на развіццё двухбаковых сувязяў. У прыватнасці, дасць магчымасць актывізаваць прыгранічнае супрацоўніцтва ў сферах гандлю, турызму, спорту, культуры, пашырыць кантакты мясцовых улад і дзелавых колаў. Істотна спросціцца парадак уезду на тэрыторыю Беларусі этнічных беларусаў, якія кампактна пражываюць у рэгіёнах Латвіі, прылеглых да Беларусі.

За лістапад золатавалютныя рэзервы павялічыліся на 2,74 млрд доларaў

Такія папярэднія звесткі паведамляе ўпраўленне інфармацыі Нацыянальнага банка.

Атрымліваецца, што на 1 снежня ўзровень рэзерваў у вызначэнні Спецыяльнага стандарту распаўсюджвання дадзеных МВФ дасягнуў 7,38 млрд долараў ЗША (у нацыянальным вызначэнні — перавысіў 8,92 млрд). Павелічэнню золатавалютных рэзерваў паспрыялі продаж акцый ААТ «Белтрансгаз» (2,5 млрд долараў) і канвертацыя нерэзервовых актываў у рэзервовыя.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 02.12.2011 г. (для б/н разлікаў)				Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ	
▼1 долар ЗША	8 580,00	1 чэшская крона	445,40	USD	30,8486
▲1 еўра	11 540,00	1 польскі злоты	2 562,61	10 UAH	38,4814
1 латвійскі лат	16 539,76	▲1 расійскі рубель	278,00	10000 BYR	35,9122
1 літоўскі літ	3 344,51	1 украінская грыўня	1 070,29	EUR	41,5068

Агенцтва Уладзіміра Грыцкевіча

АД ТЭОРЫІ — ДА ПРАКТЫКІ

Сустрэчы з жыхарамі Мазырскага раёна і Гомеля правёў старшыня Камітэта Дзяржаўнага кантролю Беларусі Аляксандр Якабсон у межах маніторынгу працы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб.

У абласным цэнтры кіраўнік галоўнага кантрольнага ведамства краіны сустрэўся са студэнтамі Беларускага гандлёва-эканамічнага ўніверсітэта спажывецкай кааперацыі і працаўнікамі спажывецкай кааперацыі рэгіёна. Дыялог быў вельмі актыўным, Аляксандр Якабсон не толькі слухаў, але і задаваў пытанні. З адной са студэнтак ён пачаў дыскусію наконт стварэння холдынгу, са студэнтам пагутарыў па праекце стварэння кансалтынгавай кампаніі, у іншага паціквіўся поглядам на сённяшнюю эканамічную сітуацыю ў краіне. Трэба сказаць, студэнты адказвалі ўпэўнена і ў асобных выпадках пераходзілі на англійскую мову. Маладыя людзі прапанавалі самыя розныя праекты паляпшэння нашага жыцця: сацыяльныя, эканамічныя, экалагічныя... Аляксандр Якабсон пераводзіў усё ў практычную плоскасць і пошук рэальных магчымасцяў для ўвасаблення тых ці іншых прапаноў. Два пяцікурснікі Беларускага гандлёва-эканамічнага ўніверсітэта спажывецкай кааперацыі, Уладзіслаў Варажун і Раман Цімохін, расказалі пра свой вопыт працаўладкавання, які пачаўся з 15 гадоў — у якасці рознарабочых. Цяпер хлопцы падпрацоўваюць у прыватных прадпрыемствах бухгалтарамі.

— Я размяжоўваю паняцці: студэнт і навучэнец ВНУ, — сказаў Уладзіслаў. — Апошні ходзіць на пары, рыхтуецца да заняткаў. А студэнт — гэта лад жыцця. Не толькі вучоба, але і ўдзел у навуковых праектах, у працы.

— Студэнты — аптымісты па жыцці, — адзначыў у адказ Аляксандр Якабсон. — Мне вельмі спадабаўся выраз пра тое, што студэнт і навучэнец універсітэта — розныя паняцці. Так, студэнт сёння пры жаданні можа зарабляць сабе на жыццё, а не толькі жыць за кошт стыпендыі і бацькоў. Што засмуціла — паўсюль, у кожным студэнцкім калектыве, маладых людзей хвалюе пытанне працаўладкавання. Мяркую, што першае працоўнае месца ім дзяржава павінна забяспечыць у любым выпадку. Для чаго ж тады мы іх вучым? Каб эканоміка атрымала патрэбных спецыялістаў. Калі спецыялісты не запатрабаваны, трэба падумаць — ці ўсё правільна мы робім? Што тычыцца праектаў, якія прапанавалі студэнты, то яны былі дастаткова цікавыя, прадуманыя — як ідэі, але адчуваецца чыста тэарэтычны падыход, недахоп практыкі. Дарэчы, самі студэнты гаварылі пра тое, што ім не хапае практычных навыкаў. Трэба, каб кафедры ўніверсітэта мелі свае філіялы на вытворчасцях. І студэнты маглі б не толькі вачыма, але і рукамі «памацаць» вытворчасць.

Між тым, самымі частымі пытаннямі, якія задаваў старшыня КДК Беларусі Аляксандр Якабсон студэнтам, былі: «Што вас хвалюе ў жыцці? Якія праблемы ёсць у горадзе, што недапрацоўваюць улады?» Цікавіўся, колькі сёння каштуе зняць кватэру і хто аплачвае яе. На пытанне аб магчымасці працаўладкавання ў дэпартаменце фінансавых расследаванняў адказаў так:

— Мы бяром грамадзянскіх асоб. У тым ліку выпускнікоў, у асноўным з БДУ. Але ж калі ёсць жаданне, мы правядзём гутарку і з выпускнікамі вашай ВНУ. Тут галоўнае — мець аналітычнае мысленне.

У рамках рэспубліканскага маніторынгу працы дзяржорганаў са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб прайшла і сустрэча з кіраўнікамі розных узроўняў таварыства «Белспажыўсаюз».

— Мы зараз завяршаем праверку спажывецкай кааперацыі рэспублікі, у нас шмат нараканняў да гэтай галіны, — адзначыў Аляксандр Якабсон. — На прыкладзе Гомельшчыны мы вывучаем сітуацыю і вызначаем, як выходзіць з няпростых сітуацый, што ўтварыліся. Вялікі пласт працы складае нарыхтоўчая дзейнасць. Тут вельмі шмат праблем. Прыведу толькі адзін прыклад: сёлета ад усяго аб'ёму нарыхтаваных і закупленых у насельніцтва грыбоў спажывецкая кааперацыя складае толькі 4 %. Астатняе — прыватны сектар. Атрымліваецца, што такая магутная сістэма, разгалінаваная па ўсёй рэспубліцы — і такая невялікая ўдзельная вага ў гэтым працэсе? Ненамнога вышэйшы гэты працэнт і па нарыхтоўцы ягад, пладоў — у межах 10-20 %. Ёсць шмат фармалізму ў справе справаздач па нарыхтаванай прадукцыі: на паперы ёсць, а рэальна — няма. Мы будзем гэтае пытанне разглядаць на калегіі камітэта дзяржкантролю, але спачатку тут, на Гомельшчыне.

У рамках маніторынгу на Гомельшчыне праходзілі прыём грамадзян і сустрэчы з жыхарамі Рагачоўскага, Жлобінскага, Жыткавіцкага і Мазырскага раёнаў. Дарэчы, папярэдні дэталёвы маніторынг праз дзяржаўных органаў і арганізацый са зваротамі грамадзян, які праводзіцца ў адпаведнасці з даручэннем кіраўніка дзяржавы, праходзіў у Гомельскай вобласці сёлета ў канцы чэрвеня.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Надзея на льготны крэдыт па ранейшых умовах застаецца

Ліст

...Кажуць, калі топішся, то і за брытву схопішся. Вось і мы, забудоўшчыкі жыллёва-будаўнічых спажывецкіх кааператываў (ЖБСК) горада Мінска, ва ўсе інстанцыі звяртаемся са сваім крыкам «SOS». Нельга сказаць, што яго не чуюць: адказы мы атрымліваем, але... Па парадку.

Усе ЖБСК (а ўсяго іх больш 30-і) сфарміраваны з ліку асоб, якія стаялі ў чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў. Прычым большасць — не менш як 20 гадоў. У спісах забудоўшчыкаў ёсць ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, воіны-інтэрнацыяналісты, шматдзетныя сем'і, а таксама сем'і, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў і г.д. Усім нам прапануўвалі будаваць жыллё з прыцягненнем ільготнага крэдыту з розніцай 20 кв. м на чалавека. Усіх папярэджвалі аб магчымасці ўнясення некаторых сум уласнымі сродкамі. Адпаведна гэтае, што нам прыйдзецца аплачваць выдзеленыя кватэры ў поўным памеры...

За паўтара года, цягам якіх мы з'яўляемся членамі кааператываў, чаго толькі ні давялося перажыць: не раз пераносіліся тэрміны пачатку будаўніцтва, не раз (у некалькі разоў і без гарантыі, што гэтая цана — канчатковая) павышаўся кошт квадратнага метра, не раз прыпынялася крэдытаванне. І ў завяршэнне — змяненні яго ўмоў: «уразанне» колькасці квадратных метраў на чалавека і змяненне працэнтнай стаўкі.

Чым гэта абернецца для канкрэтных забудоўшчыкаў? Вось прыклады (для разліку ўзяты кошт 3 млн за квадратны метр):

Шматдзетная сям'я з 5 чалавек будуе кватэру 100 кв. м. Пры змяненні ўмоў яна павінна будзе аплаціць сваімі сродкамі 25 кв. м (гэта значыць, 75 000 000 рублёў).

Маладая сям'я з 3 чалавек, будуючы кватэру плошчай у 60 квадратных метраў і пазбавіўшыся пры гэтым права на льготны крэдыт, павінна будзе аплачваць яе цалкам, для чаго спатрэбіцца 180 000 000 рублёў.

Сям'я з 4 чалавек, якая выхоўвае дзіця-інваліда і будуе кватэру 80 кв. м — аплаціць сваім сродкамі 25 квадратных метраў (г.зн. 60 000 000 рублёў)...

Што ж атрымліваецца? А тое, што нам паўтара года таму прапанавалі будаўніцтва на пэўных умовах, з прыцягненнем ільготных крэдытаў. Мы пагадзіліся, разлічвалі на свае сілы. Цяпер жа...

Нашы даходы проста не сувымерныя з коштам кватэр!

Нам кажуць: рыхтуйце грошы, пазычайце ў родных, знаёмых, сяброў, брыце крэдыт на агульных падставах пад 31%.

Але ж тады, нават пры будаўніцтве аднапакаёвай кватэры, штомесячны плацеж будзе складаць каля 5 000 000 рублёў. Якую ж трэба мець працу і якую зарплату, каб такія грошы плаціць? Тым больш што ніхто нават прыблізна не можа сказаць, у што выльецца кошт квадратнага метра на фінішы, пры здачы дома. А менавіта ад гэтай канчатковай цаны і будзе залежаць агульны кошт кватэры і адпаведна сумы, якую нам, забудоўшчыкам, трэба будзе плаціць са сваёй кішэні... Таму вельмі просім не пакінуць без увагі наш ліст. І нашы праблемы.

Валерый ІГНАЦЕНКА, Таццяна АЎРАМЕЦ, Вольга СПІСАК і іншыя (усяго 691 подпіс).

...І КАМЕНТАРЫЙ

Па тлумачэнні рэдакцыя звярнулася да **старшыні Камітэта будаўніцтва і інвестыцый Мінгарвыканкама Аляксандра ДАМЕНІКАНА**. На яго думку, нельга абагульняць сітуацыю з усімі ЖБСК сталіцы, бо па кожным асобным доме будзе прынята сваё рашэнне.

Вядома, што льготнае крэдытаванне па ранейшых умовах захаваецца толькі па дамах тых жыллёва-будаўнічых спажывецкіх кааператываў, якія дабудуюцца сёлета. Аднак горадам прынята рашэнне аб накіраванні дадатковых 96 млрд рублёў па лініі льготнага крэдытавання і па асобных дамах, дзе ўвод у эксплуатацыю запланаваны на 2012 год. Больш за тое, цяпер падрыхтаваны праект указа кіраўніка дзяржавы, дзе гаворыцца, што тыя грамадзяне, якія ўжо заключылі з «Беларусбанкам» дагаворы аб ільготным крэдытаванні, будуць дакрэдытоўвацца канчаткова. А вось тыя, хто такіх дагавораў не заключыў, будуць будавацца ўжо па новых умовах.

Так, у новым годзе прапанавана знізіць нарматыў ільготнага крэдытавання менавіта ў сталіцы з 20 да 15 квадратных метраў на чалавека. Гэта вымушаная мера, бо ў сённяшніх складаных умовах дзяржава ўжо не мае фінансавых магчымасцяў прапанаваць усім жыллёвым чаргавікам будаваць вялікія па плошчы кватэры практычна бясплатна, бо інакш чарговая хваля інфляцыі «з'есць» нашу эканоміку.

Што тычыцца шматдзетных сем'яў, то ім у новым годзе будуць прапаноўвацца самыя спрыяльныя ўмовы льготнага крэдытавання. Крэдыт, як мяркуецца, будзе выдавацца на 40 гадоў пад 1 працэнт гадавых. Пагадзіцеся, што такі працэнт пры сённяшняй стаўцы рэфінансавання 40% з'яўляецца добрым падарункам для забудоўшчыкаў.

Сяргей КУРКАЧ.

Аляксандр СУРЫКАЎ:

«Дасягнуты вялікі інтэграцыйны поспех»

Асаблівасцям развіцця інтэграцыйнага працэсу на постсавецкай прасторы была прысвечана прэс-канферэнцыя Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Расійскай Федэрацыі ў Беларусі А.А. Сурыкава.

Палітыкі нуль — адна эканоміка

Так вельмі сцісла можна ахарактарызаваць змест ацэнкі расійскім паслом апошніх падзей у сферы інтэграцыі Беларусі, Казахстана і Расіі. У створанай імі Адзінай эканамічнай прасторы дзверы адчыненыя для іншых былых савецкіх рэспублік. Зараз ідзе працэс фарміравання новага рынку. Пры гэтым, заўважыў пасол, трэба зрабіць высновы з памылак Еўразасаюза, які пайшоў на значнае пашырэнне ЕС без уліку гатоўнасці да гэтага адказнага кроку краін-навічкоў. Большасць з іх па многіх пазіцыях была не падрыхтавана жыць і суіснаваць па адзіных правілах і законах разам з развітымі краінамі ЕС. Але на тым этапе еўрапейскай інтэграцыі пераважалі палітычныя мэты і задачы, калі толькі-толькі скончылася «халодная» вайна і Бруселю трэба было замацаваць свае палітычныя прыярытэты ў пэўных рэгіёнах постсавецкай Еўропы. Сёння памылковасць такога падыходу стала відавочнай.

Таму лідары Беларусі, Казахстана і Расіі надаюць вялікую ўвагу разумнаму, збалансаванаму спалучэнню нацыянальных і наднацыянальных інтарэсаў трох дзяржаў, каб гэтыя інтарэсы падчас інтэграцыі не ўступалі ў супярэчнасць. Для гэтага будуць створаны наднацыянальныя органы кіравання. Еўразійская эканамічная камісія (ЕЭК) будзе працаваць пад кіраўніцтвам Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета. ЕЭК плануецца дэлегаваць больш за 170 нацыянальных паўнамоцтваў — у прыватнасці, па пытаннях гандлю, энергетыкі, транспарту, устанлявання мытных пошлін з іншымі краінамі і г.д. Падчас інтэграцыі, падкрэсліў Аляксандр Сурыкаў, да канца фарміравання Адзінай эканамічнай прасторы заканадаўствы трох дзяржаў будуць зведзены ў агульны звод законаў. Гэта трэба зрабіць для таго, каб паспяхова ўвайсці ў трэцюю стадыю інтэграцыі — Еўразійскі эканамічны саюз, які будзе шчыльна займацца толькі эканомікай у інтарэсах трох дзяржаў. Пытанні палітыкі, ваенна-тэхнічнага, культурнага, сацыяльнага супрацоўніцтва будуць не ў яго кампетэнцыі, падкрэсліў пасол Расійскай Федэрацыі.

Вострая фаза крызісу скончылася

Пасол падзяліўся назіраннямі і думкамі аб сённяшняй сітуацыі ў нашай краіне. Па словах Аляксандра Сурыкава, Беларусь мінула вострую фазу крызісу. Пад гэтай фазай пасол меў на ўвазе той перыяд, калі не хапала валюты, пастаянна раслі цэны. Зараз жа наступіла стабілізацыя. Аляксандр Аляксандравіч быў скупы на прагнозы наконт развіцця далейшай эканамічнай сітуацыі ў нашай краіне. Ён, у прыватнасці, сказаў, што яму складана прагназаваць наступныя дзесяці беларускага кіраўніцтва. Аднак ён упэўнены ў тым, што «рух у любым выпадку будзе ў бок паляпшэння». А ўзровень жыцця беларусаў ужо з 1 студзеня 2012 года пачне паляпшацца. Поўнае ж аднаўленне сітуацыі ў краіне варта чакаць у 2013 годзе. Аптымізм пасла заснаваны на тым, што ў Беларусі больш перадумоў дастойнага выйсця з крызісу, чым гэта было ў свой час у Расіі, калі яе «жорстка шкуматаў» надзвычай востры крызіс, а істотнай дапамогі звонку краіне не паступала. Па словах пасла, у 1998 годзе Расія не толькі трапіла ў сістэмны крызіс, але дайшла аж да дэфолту. Крызіс быў больш магутным у параўнанні з Беларуссю, а сітуацыя ў яго краіне была значна горшай. Таму даволі хутка эканоміка і ўзровень жыцця ў Беларусі адновяцца да ўзроўню пачатку 2011 года, выказаў упэўненасць пасол.

Аб цэнах на газ і нафту

У адказе на пытанні па гэтай тэме пасол спаслаўся на апошнія падпісаныя кантракты аб пастаўках газу ў Беларусь і яго транспарціроўку праз тэрыторыю краіны ў 2012—2014 гадах. Дыпламат нагадаў, што цана газу складзе 160,5 долара за тысячу кубаметраў. Гэта дазволіць Беларусі, па словах Аляксандра Сурыкава, мець дадаткова каля двух мільярдаў долараў. Дыпламат таксама расказаў аб выгадзе для Беларусі ад канчатковага продажу акцый ААТ «Белтрансгаз» расійскаму ААТ «Газпрам». Сродкі ад продажу можна будзе накіраваць на папаўненне золатавалютных рэзерваў. Акрамя гэтага, Беларусь можа быць упэўненай у захаванні транзіту праз яе тэрыторыю расійскага газу ў значных аб'ёмах, захаванні шасці з паловай тысяч рабочых месцаў, паступленні падаткаў у бюджэт і г. д.

Што датычыцца нафты, то пасол выказаў сумненне ў тым, што да канца гэтага года Беларусь і Расія змогуць дамовіцца аб так званай прэміі на нафту. Пакуль падчас перамоў бакі не хочуць саступаць адзін аднаму, кожны ўпарта прытрымліваецца занятай пазіцыі. Сутнасць пытання ў тым, што беларускія кампаніі за адну тону імпартуемай нафты плацяць расіянам прэмію ў 45 долараў. Беларусы дабіваюцца зніжэння прэміі прыкладна да 20 долараў. Трываласць расіян дыпламат патлумачыў тым, што выдаткі кампаній па здабычы нафты надзвычай высокія, бо радовішчы знаходзяцца пераважна на Крайняй Поўначы, дзе працаваць даводзіцца ў жорсткіх кліматычных умовах. На думку дыпламата, бакі ўсё ж знойдуць рашэнне, але не раней студзеня 2012 года. Аднак Аляксандр Сурыкаў упэўнены ў тым, што нягледзячы на адсутнасць дамоўленасці аб прэміі, перабояў з пастаўкамі нафты ў Беларусь у пачатку новага года не будзе.

Пра членства ў СГА

Спыталі Аляксандра Сурыкава і пра тое, як уступленне Расіі ў Сусветную гандлёвую арганізацыю (СГА) адаб'ецца на якасці інтэграцыі і ў цэлым на эканамічным супрацоўніцтве з Беларуссю. Той адказаў лаканічна: «Ніяк не адаб'ецца». І дадаў, што ўсе інтэграцыйныя пагадненні і дагаворы Беларусі, Казахстана і Расіі пісаліся з улікам патрабаванняў і нормаў СГА. Пасол сказаў таксама, што ў гэтую арганізацыю Расія ўступае ўжо 18 гадоў і, хутчэй за ўсё, у сярэдзіне наступнага года яна зможа нарэшце стаць членам СГА. А гэта ў сваю чаргу дазволіць Маскве аказваць больш эфектыўную падтрымку Беларусі на яе шляху ў Сусветную гандлёвую арганізацыю.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

Абзац

◢ Два чалавекі загінулі і трое траўмаваліся ў выніку аварыі, якая адбылася на аўтадарозе Мінск — Нацыянальны аэрапорт «Мінск». 33-гадовы жыхар Мінска, кіруючы аўтамашынай «Рэно», выехаў на палосу сустрэчнага руху і сутыкнуўся з аўтамашынай «Ісузу» пад кіраўніцтвам 50-гадовага жыхара Смалявіч. У выніку сутыкнення «Рэно» загарэўся. Абодва кіроўцы загінулі на месцы здарэння, трое пасажыраў «Ісузу», жыхары Смалявіч, змешчаныя ў бальніцу.

◢ **У Мінску вартаўнік будаўнічага аб'екта загінуў на пажары. Інцыдэнт адбыўся на вуліцы Казіміраўскай, дзе паблізу ад новабудоўлі знаходзяцца бытоўкі для рабочых. Адна з іх загарэлася, а калі пажар быў патушаны, то там выявілі абгарэлы труп вартаўніка — мінчаніна 1967 г.н. Па папярэдніх звестках, прычынай пажару стала парушэнне правілаў карыстання пячным ацяпленнем альбо непатушаная цыгарэта. Праверку вядзе пракуратура.**

Поўны абзац

◢ У паўночным індыйскім штаце Утар-Прадэш два фермеры выпусцілі дзясяткі змей, у тым ліку кобраў, у будынку падатковай інспекцыі, пратэстуючы супраць хабарніцтва. Як паведаміў супрацоўнік інспекцыі, фермеры прыйшлі ў офіс з трыма мяхамі, у якіх было каля 40 змей. Супрацоўнікі інспекцыі і жыхары, якія ў той час апынуліся ў офісе, сталі ў паніцы разбягацца і залазіць на сталы. Паліцыі пазней удалося злавіць усіх змей. Паведамленняў аб пацярпелых не было. Фермеры пайшлі на такую меру, таму што доўгі час дамагаліся ад падаткавікоў дакументаў аб уласнасці на зямлю, аднак чыноўнікі ўтрымлівалі дакументы і патрабавалі за іх хабар. Прадстаўнік адміністрацыі штата назваў іх меры барацьбы з хабарніцтвам непрымальнымі. Абодвух фермераў шукае паліцыя.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Здароўе нацыі

«ЗЛЫЯ» КЛЕТКІ, або Хто перашкаджае выяўляць рак на ранніх стадыях?

КАЛІ БЕЛАРУСЫ пачнуць сачыць за сваім здароўем, у краіне значна зменшыцца колькасць выпадкаў раку на позніх стадыях. На ранніх жа стадыях анкалагічныя захворванні, як вядома, вылечныя. Разам з тым, у чалавека, які аднойчы перанёс рак і вылечыўся, павышаецца верагоднасць узнікнення раку ў іншым органе, а значыць, зноў жа, яму неабходна сачыць за сваім здароўем — трымацца здаровага ладу жыцця, у тым ліку своечасова праходзіць медыцынскія агляды. Аб асаблівасцях дыягностыкі раку расказвае рэктар Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, доктар медыцынскіх навук, прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі Юрый ДЗЯМІДЧЫК.

— У аднаго пацыента можа быць і некалькі відаў раку. Яны могуць узнікаць сінхронна або з разбежкай у часе. Вядома і дакладная сувязь паміж некаторымі лакалізацыямі раку. Рак цела маткі, абадочнай кішкі і малочнай залозы маюць падобныя фактары рызыкі і могуць правакаваць пераход ад аднаго да другога... Ёсць органы, у якіх пухліны ўзнікаюць надзвычай рэдка. Так, клеткі сэрца не дзялюцца, не аднаўляюцца, а значыць, тут амаль не можа быць пухлін... А ўвогуле ў любым органе, у любой тканцы могуць фарміравацца пухліны рознага паходжання, розныя па інтэнсіўнасці росту і па сваіх прагнозах.

— Звычайна рак з'яўляецца там, дзе меў месца пэўны хранічны працэс. Аднак няправільнае дзяленне здольнае пачацца і на нязмененай тканцы...

— Сапраўды, некалі меркавалі, што рак шчытападобнай залозы фарміруецца з клетак вузлавога валляка. Лічылася, што валляк можа перайсці ў рак і наадварот. Аднак сёння мы дакладна ведаем, што гэта два незалежныя сцэнарыі — за выключэннем, хіба, адной формы раку, якая здараецца надзвычай рэдка і якой папярэднічае С-клетачная гіперплазія, калі клеткі пачынаюць актыўна дзяліцца і толькі праз нейкі час з іх вырастае пухліна... Цяпер мы кажам, што ў адной залозе можа быць і валляк, і рак, і адэнома, і тырэаідыд... Калі рак узнікае на нязмененай тканцы, яго называюць de-novo. Скажам, у дзяцей пухліны бываюць даволі рэдка, аднак менавіта ў іх з мяккіх тканак фарміруецца рак de-novo. 30-50 працэнтаў выпадкаў меланомы маюць менавіта такое паходжанне.

— Што маецца на ўвазе пад стадыямі захворвання?

— Выбар адпаведнага метаду лячэння, прагноз сітуацыі. Хоць рак ад раку адрозніваецца. Вось рак шчытападобнай залозы мы навучыліся лячыць на любой стадыі, чаго не скажаш пра лейкемію, напрыклад.

— Наколькі складана выявіць рак на самых ранніх стадыях?

— Трэба адрозніваць паняцці ранняга раку і ранняй дыягностыкі. Ранні рак — гэта марфалагічны крытэрый, калі мы кажам пра павярхоўныя змены ў эпітэліі. Пухліна не дасягнула сасудаў, і працэс яе распаўсюджвання яшчэ не пачаўся. Пры такім стане мы маем самы спрыяльны прагноз вылечвання, аднак гэта звычайна выпадковая знаходка. Ранняя дыягностыка — гэта выяўленне раку на I і II стадыях. Медыцына цалкам здольна выявіць рак на такіх стадыях. Праблема заключаецца толькі ў тым, што пацыенты прыходзяць на абследаванне, калі нешта пачало істотна непакоіць, а гэта бывае ўжо на больш познім этапе.

— Ці рэальна вынайсці які-небудзь універсальны спосаб дыягностыкі раку?

— Сёння гэта нерэальна. Калі ўзяць біяхімічныя маркёры, то іх вядома ўжо звыш пяцісот. Выкарыстоўваецца, праўда, у лепшым выпадку каля дзясятка. Бо неспецыфічныя, могуць даваць псеўдастаноўчыя або псеўдаадмоўныя адказы. Сярод найбольш дакладных біяхімічных маркёраў можна назваць прастатспецыфічны антыген для вызначэння раку прастаты, альфа-фетапратэін — для раку печані, СА-125 — для раку яечніка і некаторыя іншыя. Аднак усё роўна вынік такога аналізу не дазваляе паставіць канчатковы дыягназ, а толькі акрэслівае сітуацыю, у якой трэба разбірацца з дапамогай іншых метадаў абследавання.

— Можа быць, вы падкажаце мінімум гэтых абследаванняў?

— Самому сабе прызначаць нічога не трэба. Па-першае, у нашай краіне па такіх распаўсюджаных анкалагічных захворваннях, як рак малочнай залозы, прастаты і шчытападобнай залозы, праводзяцца скрынінгі, спецыяльныя масавыя абследаванні. Па-другое, падчас іншых абследаванняў, прызначаных па іншых паказаннях, можна выявіць або западозрыць пухліны. Ультрагук, камп'ютарная і магнітна-рэзанансная тамаграфія дазваляюць убачыць вузлавое ўтварэнне ў органе. Каб вызначыць яго паходжанне, бярэцца біяпсія. Па-трэцяе, мы сёння кажам аб неабходнасці працаваць з групамі рызыкі па раку. Так, у групе рызыкі па раку лёгкага — мужчыны пасля 40 гадоў, са стажам курэння звыш 10 гадоў. Рак шыйкі маткі звязаны з вірусам папіломы чалавека. Рак тоўстай і прамой кішкі звязаны з наяўнасцю паліпаў у кішэчніку, сямейнай гісторыяй захворвання на гэты від раку, курэннем, малой фізічнай актыўнасцю, дыетай з высокім утрыманнем тлушчу і нізкім утрыманнем клятчаткі, гародніны і фруктаў, злоўжываннем алкаголем... Паколькі рак малочнай залозы звязаны з пэўнымі спадчыннымі генетычнымі мутацыямі, у Еўропе пачалі працаваць і з гэтым фактарам — прапагандуюць прафілактычныя хірургічныя ўмяшанні. Калі ў жанчыны выяўляецца мутацыя гена brca, то з верагоднасцю 80 працэнтаў можна гаварыць аб развіцці ў перспектыве раку малочнай залозы. У нашай краіне такога кшталту аперацыі не выконваюцца. Мы проста кажам такім пацыентам, што трэба часцей сустракацца з доктарам і рэгулярна абследавацца.

— Якое абследаванне можа дазволіць паставіць дыягназ раку?

— Канчатковы дыягназ нам дапамагае выставіць біяпсія — працэдура забору тканкі для мікраскапічнага даследавання, самага дакладнага метаду. Біяпсія можа дапамагчы ў вызначэнні характару пухліны — дабраякаснага або злаякаснага. Біяпсія таксама прымяняецца для праверкі наяўнасці клетачных анамалій — перадракавых змяненняў, якія часта выяўляюцца да развіцця ракавай пухліны. Мікраскапічнае даследаванне ўзору тканкі можа спрагназаваць цячэнне пухліннага працэсу і эфектыўнасць абранага метаду лячэння. Чым больш нармальны выгляд у клетак і чым меншая іх колькасць дзеліцца, тым большая верагоднасць таго, што пухліна расце павольна і што яна будзе рэагаваць на лячэнне. На падставе характару клетак пухліну адносяць да пэўнай ступені — ад I да IV.

Эфектыўнасць вышэйназванага метаду неаднолькавая для кожнага органа. Тут патрэбна высокая кваліфікацыя персаналу, вопыт і практыка, паколькі забор клетак робіцца, як правіла, з некалькіх участкаў органа. Для раку прастаты такіх кропак шэсць. Бо, сапраўды, можна ўзяць клеткі са здарова га ўчастку або з зоны запалення і атрымаць псеўдаадмоўны вынік.

— Ці можна далучыць да высокаэфектыўных метадаў візуальнага абследавання пазітронна-эмісійную тамаграфію, якая пакуль не выконваецца ў Беларусі?

— Гэты метад дазваляе не проста ўбачыць пухліну, а ўбачыць яе ў аб'ёме. Пацыенту ўводзіцца радыеактыўна пазначаная глюкоза, якая назапашваецца ў месцах інтэнсіўнага дзялення клетак. Гэта вельмі добра відаць, аднак метад нельга назваць бязгрэшным, ён можа даваць псеўдастаноўчыя вынікі, хоць, безумоўна, зону нашага інтарэсу мы не прапусцім. Проста выкананне ПЭТ-дыягностыкі патрабуе далейшага выканання камп'ютарнай тамаграфіі. Акрамя таго, ПЭТ не падыходзіць для правядзення масавых абследаванняў. Для вытворчасці радыеактыўнай глюкозы патрэбны спецыяльны прыбор — цыклатрон. Вырабленая ў ім глюкоза «жыве» ўсяго 1 гадзіну 10 хвілін. Нават сусветныя клінікі могуць дазволіць сабе набыццё непасрэдна апарату, але не цыклатрону... Я думаю, не варта настройвацца на цуд-тэхналогіі па выяўленні пухлін. Самае важнае — самае простае. Здаровы лад жыцця плюс рэгулярнае абследаванне даступнымі, добра вядомымі метадамі.

— Здаецца, апошнім часам беларусы пачалі больш пільна сачыць за сваім здароўем, шмат грошай траціць на платныя медыцынскія паслугі...

— Жанчыны як сачылі, так і сочаць за сваім здароўем, чаго не скажаш пра мужчын, у якіх па-ранейшаму часта мы выяўляем запушчаныя формы. Сёння трэба гаварыць ад нейкіх нават агрэсіўных формах фарміравання здаровага ладу жыцця. Усе ведаюць, што курыць шкодна, але кураць. Усе ведаюць, што, з пункту гледжання анкалагічных захворванняў, бяспечная доза алкагольных напояў — 40 мл у суткі для мужчын і 20 мл — для жанчын. Але колькі людзей не разважаюць над тым, што лішак алкаголю прыводзіць да хранічных хвароб, якія спрыяюць узнікненню раку падстраўнікавай залозы, жоўцевых пратокаў, печані...

Святлана БАРЫСЕНКА.

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении 6 января 2012 г. открытого аукциона по продаже обращенного в доход государства имущества

Предмет торгов (наименование, характеристики продаваемого имущества)	Автозаправочная станция общей площадью 32 кв. м (инв. номер 122/С-12667)
Сведения о земельном участке	Кадастровый номер 123400000001000621, площадь – 0,1000 га, назначение – строительство и обслуживание автомобильной заправочной станции
Местонахождение продаваемого имущества	Брестская область, Ивацевичский район, на автодороге Н-706 Коссово-Нехачево, км 1
Организатор аукциона	УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, тел. (017) 227 40 22
Начальная цена	133 056 000 белорусских рублей
Сумма задатка	13 000 000 белорусских рублей

Аукцион проводится в порядке, установленном Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369; получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется участником, выигравшим торги.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Згодна з версіяй праваахоўнікаў, прадпрымальны 26-гадовы дырэктар распрацаваў няпростую фінансавую схему. Частка зароблены прадпрыемствам грошай накіроўвалася на яго асабісты банкаўскі рахунак. Увогуле праз дагаворы-пазыкі, якія малады чалавек заключаў фактычна з самім сабой, ён завалодаў сумай у памеры больш за Br87 млн. Паводле слоў затрыманага, на такі ўчынак ён пайшоў з-за няздольнасці выплаціць узяты раней крэдыт.

Даведацца пра махінацыі ўдалося ў вы

ОБЪЯВЛЕНИЕ
О ПРОВЕДЕНИИ ХОЗЯЙСТВЕННЫМ СУДОМ ВИТЕБСКОЙ ОБЛАСТИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Лепельпромшвеймебель» (Витебская область, г. Лепель, ул. Володарского, 1, УНН 300038815), методом повышения начальной цены с размером первого шага торгов пять процентов от стоимости лота.

Полный перечень реализуемого имущества

№№ лота	Название и описание имущества	Количество	Оценка белорусских рублей
1	Станок сверлильный 4-шпиндельный	1	2 180 400
2	Станок круглопильный Ц 6-286	1	1 512 000
3	Станок горизонтально-сверлильный	1	8 092 800
4	Станок 4-сторонний С 16-1А	1	12 354 000
5	Станок сверлильный СВПА-2	1	1 406 400
6	Станок сверлильный СВПГ-2	1	1 406 400
7	Станок круглопильный Ц6-2	1	1 134 000
8	Станок круглопильный (собств. изгот.)	1	852 000
9	Станок круглопильный С6-280	1	3 781 200
10	Станок рейсмусовый Ср-8	1	6 884 400
11	Станок фрезерный СВПА-2	1	4 689 600
12	Станок фрезерный СФ-4	1	11 636 400
13	Станок плоскошлифовальный ЗГ71	1	8 352 000
14	Станок плоскошлифовальный	1	5 293 200
15	Станок плоскошлифовальный	1	5 293 200
16	Станок вертикально-сверлильный С4ГВ	1	21 572 400
17	Станок торцовочный	1	4 011 600
18	Станок «Лучеса» УОДМ-1	1	3 764 400
19	Электротельфер Т1	1	3 573 600
20	Вайма для сборки	1	4 850 400
21	Вайма для сборки	1	4 850 400
22	Станок для завинчивания винтов	1	4 689 600
23	Станок заточной ЗБ634	1	6 884 400
24	Станок для заточки режущих инструментов ВЗ 367	1	6 394 800
25	Пилорама Р 63-4Б	1	27 968 400
26	Пилорама Р 63-4Б	1	27 968 400
27	Станок ЦДК-5	1	10 582 800
28	Станок форматно-раскроечный	1	19 414 800
29	Пресс гидравлический	1	32 523 600
30	Пресс гидравлический	1	32 798 400
31	Пресс гидравлический	1	34 334 400
32	Станок шипорезный	1	7 416 000
33	Станок барабанно-шлифовальный	1	9 134 400
34	Станок кромкофанеровальный МОК-4-22	1	7 906 800
35	Станок плоскошлифовальный ШЛПС-5	1	5 293 200
36	Станок дискошлифовальный ШЛДБ-5	1	9 134 400
37	Станок барабанно-шлифовальный	1	9 134 400
38	Станок прирезной	1	3 764 400
39	Станок шлифовальный ШЛДБ-4	1	9 134 400
40	Тележка ТС, 10 шт.	1	2 784 000
41	Электротельфер Т2	1	2 144 400
42	Вентилятор ВЦП № 5	1	1 185 600
43	Вентилятор центробежный ПО № 3	1	342 000
44	Вентилятор центробежный 6,3	1	1 612 800
45	Вентилятор ВЦП-70 № 10	1	3 126 000
46	Вентилятор ВЦП-6,3	1	1 612 800
47	Вентилятор ЦИ-70 № 8	1	1 890 000
48	Вентилятор ВЦП-8	1	1 890 000
49	Станок заточной	1	1 914 000
50	а/м МАЗ 53371-029 1992 года выпуска, регистрационный знак а/м ВВ 1267	1	31 039 200
51	а/м МАЗ 54329 1994 года выпуска, регистрационный знак ВМ 1743	1	21 058 800
52	а/м ИЖ год выпуска неустановлен, регистрационный знак ВМ 8223	1	3 343 200

Время проведения торгов — 23.12.2011 в 11.00, в хозяйственном суде Витебской области, каб. 324.

Справочная информация	Хозяйственный суд Витебской области. 210101, г. Витебск, ул. «Правды», д. 32, каб. 324, http:// vitebsk.court.by/ Судебный исполнитель Халков Дмитрий Вячеславович, тел./факс. (80212) 49 13 42, (8 029) 150 24 10. Старший судебный исполнитель Бородулин Алексей Александрович, тел. (80212) 49 13 40.
Условия и порядок проведения торгов	1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903000023 в 201 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Витебск, код 259, УНН 300007670, не позднее 22.12.2011. Минимальная величина первого шага – 5% стоимости лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

Заявки принимаются в хозяйственном суде Витебской области в рабочие дни с 9.00 до 18.00.

«Поспехі беларускага трыятлона — у новым пакаленні»

А пакуль нашы трыятланісты працуюць у Дэпартаменце аховы і дзіцячым садку...

30 лістапада Беларуская федэрацыя трыятлона ўрачыста ўшанавала наймацнейшых атлетаў па выніках гэтага сезона. Найбольш вызначыліся сёлета чатырохразовы чэмпіён Беларусі Аляксандр Васілевіч і наймацнейшая трыятланістка Беларусі Наталля Барысава-Новікава. Старшыня беларускай федэрацыі трыятлона, першы сакратар ГА «БРСМ» Ігар БУЗОЎСКІ падвёў вынікі сезона:



— Калі казаць аб працы федэрацыі, то яе можна ацаніць на «чацвёрку» з мінусам па пяцібальнай сістэме. Развіццё нашага віду спорту залежыць ад масавасці. Хлопцы і дзяўчаты павінны больш ведаць пра трыятлон. У многіх існуе стэрэатып наконт марафонскай дыстанцыі, цяжкага віду спорту. Аднак трыятлонам займаюцца нават маленькія дзеці. Існуюць розныя дыстанцыі і розныя магчымасці для заняткаў, гэты від спорту якасна развівае чалавека фізічна.

Да гучных міжнародных перамог па трыятлоне нам яшчэ далёка. На Алімпійскіх гульнях гэты від спорту з'явіўся ў 2000 годзе, аднак беларускія трыятланісты пакуль не ўдзельнічалі ў Алімпіядах. **Наймацнейшы спартсмен нашай краіны Аляксандр ВАСІЛЕВІЧ** расказаў аб праблемах, з якімі сутыкаюцца спартсмены.

— У трыятлон я прыйшоў з плавання, калі там у мяне пераставалі расці вынікі. Да плавання давялося дадаць бег і язду на веласіпедзе.

— Што ведалі пра трыятлон, калі прыйшлі?

— Толькі тое, што там тры віды, больш нічога. Але адразу выйграў чэмпіянат Беларусі, нават не маючы свайго спартыўнага абсталявання. Канкурэнцыі амаль не было, бо від спорту дастаткова дарагі. Нават калі табе даюць веласіпед, «расходнікі» на яго каштуюць дастаткова дорага. Атрымліваецца даражэй, чым веласпорт: веласіпед такі ж, велатуфлі, касцюм, гідракасцюм на плаванне — спецыяльны для халоднай вады, ну і красоўкі для бегу.

— На што могуць прэтэндаваць беларусы на міжнародным узроўні?

— Хаця б паспяхова прайсці адбор на Алімпійскія гульні. Пакуль нікому з Беларусі гэта не ўдавалася. Нават на кубак свету ніхто не ездзіў.

— Гэта рэальна — прайсці адбор на Алімпіяду?

— У Лондан — не. Застаўся толькі чэмпіянат Еўропы, дзе можна атрымаць пуцёўку. Два апошнія гады на чэмпіянат Еўропы мы не ездзілі. Няма сэнсу, бо ачкі тыя ж, што і на кубках Еўропы, а канкурэнцыя — як на Алімпіядзе.

— А матэрыяльны стымул?

— А грошы плацяць толькі за 1-10 месцы.

— Інвентар прыходзіцца набываць за свае сродкі?

— Часцей за ўсё. Веласіпед калі і далі, то яго хапае толькі на год. Застаецца рама і руль, астатняе зношваецца, і трэба набываць новы.

— Наколькі можна зразумець, заняткі трыятлонам — пераважна хобі, а не прафесія?

— Я з'яўляюся супрацоўнікам Дэпартамента аховы МУС, але паколькі я — чэмпіён Беларусі, мяне на год вызваляюць ад працы, і я атрымліваю аклад, маю час для трэніровак і паездак на зборы. Таму трыятлон — больш хобі. Але ён нашмат складаней, чым плаванне.

— Якія дыстанцыі прыходзіцца пераадольваць трыятланістам?

— 1,5 кіламетра праплыць, 40 кіламетраў праехаць на веласіпедзе і 10 кіламетраў прабегчы. Такая алімпійская дыстанцыя.

— Колькі каштуе веласіпед?

— Нашы супернікі, якіх мы бачым на міжнародных стартах, выступаюць, напрыклад, на веласіпедах коштам ад 6 тысяч еўра, калёсы — па 2 тысячы еўра. Таму яны цягнуць пад гару 6 кілаграмаў, а я — усе 10. Гэта невялікая праблема — цягнуць 10, але бегчы пасля гэтак жа хутка я не змагу.

— Застаецца чакаць, калі супернік аступіцца...

— У плаванні, вядома, ніякага кантролю з боку арбітраў няма. Усе 90 чалавек стартуюць і плывуць «у адну кропку». Зразумела, што ўсе імкнуцца праплыць па найменшым радыусе. На павароце можна і атрымаць ад суперніка: і падтапіць некаторыя імкнуцца, і ўдарыць. Падчас веластарту, вядома, здараюцца завалы — ніхто ад іх не застрахаваны.

— Вы самастойна набываеце веласіпеды, касцюмы і гідракасцюмы?

— Мне, як чэмпіёну Беларусі, дапамагаюць. Веласіпед, напрыклад, мне набыў РЦОП. Гідракасцюм купілі праз тры гады, дагэтуль бралі ў таго, у каго быў.

— І колькі рэальна зарабіць у трыятлоне?

— На Кубку Еўропы першае месца ацэньваецца ў тры тысячы еўра. Ёсць камерцыйныя старты. У Амерыцы, напрыклад, ёсць старт «мільённік». За перамогу на ім плацяць мільён долараў, другое месца — 200-250 тысяч. Але каб трапіць на той жа Кубак свету, трэба быць у рэйтынгу не ніжэй за 300-е месца. Я летась за год з 600-га месца перамясціўся на 300-е. А сёлета з-за адсутнасці сродкаў нікуды не ездзілі, рэйтынгавых ачкоў не набралі, я зноў апусціўся ў раён шостай сотні. Адзінае спаборніцтва — Кубак Азіі ў Казахстане, дзе я стаў адзінаццатым па шэрагу прычын. Веласіпед мой не даляцеў, гідракасцюм своечасова не расшпіліўся... Пасля плавання я ішоў трэцім, але гідракасцюм зашпілены быў няправільна, таму мяне многія абышлі, пакуль я пераапранаўся. Ну і ехаць на чужым веласіпедзе не вельмі зручна — гэта як сесці за руль чужога аўтамабіля. Я стаў адзінаццатым, хоць летась быў трэцім.

— Гэта адзіны міжнародны старт, у якім сёлета ўдалося паўдзельнічаць?

— Быў яшчэ Кубак Балтыкі — камерцыйны старт, які я выйграў.

Наймацнейшая трыятланістка Беларусі Наталля Барысава-Новікава лічыць, што абыгрываць супернікаў можна і не на самых лепшых веласіпедах:

— Ёсць шмат прыкладаў, калі спартсменкі ездзяць на самых новых веласіпедах, але іх удаецца абыгрываць. Галоўнае, каб форма была выдатнай. Цяжка падабраць, каб і плаванне, і бег, і веласіпед ішлі аднолькава добра.

— Які ваш найлепшы вынік сёлета?

— Я стала чэмпіёнкай Беларусі па спрынце. На міжнародных стартах? На этапе Кубка Еўропы я была трынаццатай.

— Беларускім трыятланісткам рэальна трапіць на Алімпіяду?

— У красавіку наступнага года пройдзе чэмпіянат Еўропы, паспрабуем там заняць прызавое месца і паспяхова прайсці адбор.

— Наколькі гэта рэальна?

— Дзесяць адсоткаў супраць 90. За мяжой за кожны від адказвае асобны трэнер. У нас трэнер (гэта, дарэчы, мой муж) сам набывае кнігі, чытае і ставіць тэхніку па ўсіх трох відах. Мы трэніруемся разам з юніёрамі, юнакамі, мужчынамі — усе разам. Дзяўчат, якія займаюцца трыятлонам, вельмі мала — напрыклад, у Мінску іх толькі трое. Яшчэ дзве-тры — у рэгіёнах.

— Трыятлон для вас таксама толькі хобі?

— Так, я працую ў дзіцячаюнацкім клубе, сёлета я адкрыла там секцыю трыятлона. Да гэтага шэсць гадоў вяла фізічную культуру ў дзіцячым садку. Пакуль перспектывы беларускага трыятлона — у новым пакаленні. Калі з нас нічога не атрымаецца, прыйдуць маладыя спартсмены, будуць змагацца за медалі.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

Факт

Даездзіўся

Вечарам у в. Люсіна (Ганцавіцкі раён) 24-гадовы мясцовы жыхар не справіўся з кіраваннем матацыкла «Ямаха» і наляцеў на бетонны плот. Пасажыр, які ехаў з ім без шлема, загінуў на месцы, а кіроўцу даставілі ў цяжкім стане ў райбальніцу. Матацыкліста ў 2009 годзе пазбавілі права кіравання матацыклам на 3 гады, але летась яго зноў затрымалі п'яным за рулём. І вось у чарговы раз ён быў выпіўшым.

Знік запас

Майстар УПК з г. п. Гарадзішча (Баранавіцкі раён) меў у запасе 100 бутэлек гарэлкі. Пляшкі захоўваліся ў доме, які будаваўся. Неяк мужчына зірнуў у тайнік — а гарэлкі няма. Пад падазрэнне трапіў 27-гадовы мясцовы беспрацоўны: ён у той час знаходзіўся ў доме. Заведзена крымінальная справа.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ІДЭІ МАЛАДЫХ — НА РАЗВІЦЦЁ КРАІНЫ

УЧОРА Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі завяршыў прыём заявак на ўдзел у рэспубліканскім моладзевым праекце «100 ідэй для Беларусі» на найлепшую інавацыйную ідэю ў розных сферах сацыяльнага і эканамічнага развіцця краіны, цікавую для практычнай рэалізацыі.

Нагадаем, што яшчэ 20 верасня БРСМ запрасіў да ўдзелу ў праекце «100 ідэй для Беларусі» маладых даследчыкаў і рацыяналізатараў ва ўзросце ад 14 да 31 года, і за гэты час ад іх паступіла 1311 заявак.

«Залатую» сотню ідэй вызначыў экспертны савет, у склад якога ўвайшлі прадстаўнікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях, 7-мі міністэрстваў. Сярод іх быў і Сяргей Латышаў, вынаходнік і рацыяналізатар, аўтар «лятаючага» аўтамабіля і больш як 50 запатэнтаваных вынаходстваў.

З ліку найбольш цікавых праектаў, накіраваных у адрас арганізатараў у апошнія дні, можна назваць «Новае даступнае лякарства для лячэння цукровага дыябету» (аўтар Анастасія Самойлік), «Стварэнне дзіцячага музея ў Мінску» (аўтар Дар'я Трыгубава), праект «Экалагічныя шпалеры» (аўтар Майя Славінская)...

Самым яркім распрацоўкам будзе дадзена «зялёнае святло». Да прыкладу, праект «Аптымізацыя лячэбнага працэсу і прафілактыка магчымых прамянёвых ускладненняў» (аўтар Наталля Пузан) праходзіць сёння клінічныя выпрабаванні, і ўжо хутка будзе ўкаранёны ў практычную медыцыну. Рэалізацыю праекта Максіма Рабея «Пошукі святыні» плануецца пачаць у ліпені 2012 года — менавіта ў гэты час пачне сваю работу археалагічны лагер па пошуку фрагментаў Рагвалодава каменя, славутага помніка славянскай гісторыі і культуры. А праектам Сяргея Круцько «Комплекснае выкарыстанне біяцэнозу трыснягу звычайнага — новы від экалагічна чыстага будаўнічага і дахавага матэрыялу (чарот)» зацікавіліся польскія інвестары. Прэзентацыя найбольш паспяховых творчых, тэхнічных, навуковых ідэй адбудзецца 9 снежня 2011 года ў час работы Грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».

Віртуальная экспазіцыя моладзевых ідэй размешчана на інтэрнэт-партале «Моладзь Беларусі» (www.brsm.by), а таксама ў сацыяльнай сетцы «Вконтакте» ў групе «100 ідэй для Беларусі».

Кар. «Звязды».

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ ОБ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОТКРЫТОГО АКЦИОНЕРНОГО ОБЩЕСТВА «ЛАКОКРАСКА» г. ЛИДА

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
Склад коллоксилина	Склад коллоксилина, инвентарный № 420/С-40438, площадь застройки 251 м. кв., объем здания 955 м.куб., общая площадь здания 211 м.кв., фундамент – ж/бетонный, наружные и внутренние стены – кирпичные, крыша – рулонная по ж/б плитам, полы – бетонные, внутренняя отделка – штукатурка, побелка, электроосвещение – электропроводка скрытая.
Местонахождение объекта	Гродненская область, Лидский район, Дубровенский с/с,41.
Земельный участок	Кадастровый № 423684000059000024. Площадь земельного участка 0,4479 га, назначение – для обслуживания склада.
Начальная цена продажи	69 960 000 белорусских рублей с учетом НДС.
Сумма задатка	6 996 000 белорусских рублей с учетом НДС.
Продавец	Открытое акционерное общество «Лакокраска» г. Лида, 231300, г. Лида, ул. Игнатова, 71, тел./ф. 8 (0154) 52 27 55.
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41 98 32, 41 98 34
Условия аукциона	Без условий
Условия оплаты	По договоренности сторон
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 30 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225.
Аукцион состоится 4 января 2012 г. в 11.00 по адресу: г. Лида, ул. Игнатова, 71 (актовый зал заводоуправления, 3 этаж)	

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

индивидуальным предпринимателем – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209 с 8.30 до 17.30. Последний день приема заявлений – 3 января 2012 г. до 15.00.

Телефон для справок: 41 98 32, 41 98 34 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»

- Оценка оборудования и транспортных средств
- Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
- Независимая строительная экспертиза

Извещает о проведении аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 2, г. Гомель»

№ лота	Наименование объекта	Адрес объектов продажи	Начальная цена продажи, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.
1	**Производственная база ДСУ-19 г. Речица в составе:** Вагончик полевой (инв. № 10004) Здание контейнерного типа «Лесник» (инв. № 10017) Здание контейнерного типа «Лесник» (инв. № 10018) Здание весовой (инв. № 342/с-70006, инв. № 10024) Здание РММ ст. Жердь (инв. № 342/с-69984, инв. № 101050) Здание котельной ст. Жердь (инв. № 342/с-70008, инв. № 101051) Здание трансформаторной подстанции (инв. № 342/с-70009, инв. № 40011) Башня Рожновского (инв. № 342/с-70010, инв. № 10021) Подъездной ж/д путь к АБЗ Жердь (инв. № 342/с-70013, инв. № 10022) Битумохранилище (инв. № 342/с-70006, инв. № 10023) Ограждение ст. Жердь (инв. № 342/с-70011, инв. № 200016) Благоустройство ст. Жердь (асфальтобетонное, инв. № 342/с-70012, инв. № 200020) Емкость 60 м³ (инв. № 50084) Емкость 25 м³ (инв. № 50108) Виброзагрузчик (инв. № 50060) Весы ВА-2019 (инв. № 50001) Трансформатор ТД-317 (инв. № 50001) Трансформатор силовой ТМ-1000 (инв. № 40008) Камера КСО(инв. № 40009) Здание склада (инв. № 342-с/79904, инв. № 10025)	0,3 км юго-западнее ст. Жердь Светлогорского р-на Гомельской обл.	711 593 928	71 159 393

Продавец имущества: ОАО «ДСТ№ 2, г. Гомель». Цена указана с НДС. Условия продажи: без условий, вознаграждение за проведение аукциона 2%.

Срок подписания договора купли-продажи в течении 5 (пяти) рабочих дней после подписания протокола о результатах торгов.

Более подробную информацию об условиях и перечне документов для участия в аукционе можно узнать у организатора торгов ГОУ филиала «Центр «Белтехинвентаризация» по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46 и по тел.: 8(0232) 75 06 61, 75 06 63 (факс), WWW.@BTI.by

Срок подачи заявления, внесения задатка	**До 17.00 14 декабря 2011 г**. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46
Дата, время, место проведения аукциона	**15 декабря 2011 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46
Номер р/с для перечисления задатка	Р/с 3012105618108 в РД № 700 «БПС-Сбербанк», код 369, УНП 102353509
Условие продажи	Без условий.
Условие пользования	Объекты продаются в собственность.
Порядок проведения	Начальная цена лота понижается с шагом в 10% до момента, когда хотя бы один из участников аукциона согласится купить объект по объявленной аукционистом цене, но не ниже минимальной. Если при понижении начальной цены подняли свои номера два и более участника, победителем признается участник, первым поднявший свой номер. При невозможности определить победителя аукциона комиссия объявляет о снятии объекта с торгов.

Дополнительная информация по тел.: (0232) 75 06 61, 75 06 63 (факс)

ЗАЛЕЗЛІ НА ДАЧНЫ ЎЧАСТАК ПАГРЭЦЦА...

Увечары ў Светлагорску ў садова-агародніцкім таварыстве «Лясное» на дачным участку загарэлася гаспадарчая пабудова.

— На месцы пажару знаходзіліся дзве асобы без пэўнага месца жыхарства: мужчына-пенсіянер 1947 года нараджэння і жанчына 1959 года нараджэння. Да прыбыцця падраздзялення пажарных-выратавальнікаў яны спрабавалі самастойна патушыць узгаранне, аднак безвынікова, — паведаміла журналісту «Звязды» падрабязнасці здарэння старшы інспектар Цэнтра даследаванняў у галіне бяспекі жыццядзейнасці Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Таццяна Сакалоўская. — Мужчына атрымаў апёкі кісцей рук, твару першай і другой ступені (5 працэнтаў паверхні цела), жанчына — апёкі тых жа частак цела аналагічных жа ступеняў цяжкасці (12 працэнтаў паверхні). Пацярпелыя былі дастаўлены ў Светлагорскую цэнтральную раённую бальніцу. У выніку пажару агнём знішчаны дах, маёмасць унутры пабудовы, пашкоджаны сцены па ўсёй плошчы.

Трэба дадаць, што гаспадарчая пабудова не была электрафікавана. Каму яна належала — зараз высвятляецца. А прычынай пажару стала непатушаная запалка. Можна меркаваць, што пацярпелыя — улічваючы ўсе вышэйназваныя акалічнасці справы — могуць мець да здарэння непасрэдныя адносіны.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Администрация Партизанского района г. Минска
Приглашает принять участие
В ПРОВЕДЕНИИ ОБЩЕСТВЕННОГО ОБСУЖДЕНИЯ
проекта строительства многоквартирного 4-5-этажного 2-секционного жилого дома, относящегося к категории повышенной комфортности со сносом существующих многоквартирных малоэтажных домов №№ 3, 5, 7 по пер. Войсковому в г. Минске.

Заказчик на разработку проекта – ООО «Минтехнострой», разработчик проекта – ООО «Вива Капитал».

Экспозиция проекта будет располагаться в фойе здания администрации Партизанского района г. Минска по ул. Захарова, 53 **ежедневно с 9.00 до 18.00 (кроме субботы, воскресенья) в период с 12 декабря по 26 декабря 2011 года.**

Представление проекта состоится **21 декабря 2011 г. в 18.00** в актовом зале администрации Партизанского района г. Минска по ул. Захарова, 53.

Контактные телефоны: 294 66 61, 294 60 13 (отдел архитектуры и градостроительства администрации Партизанского района г. Минска). УНП 191151455

МОГИЛЕВСКИЙ ГОРИСПОЛКОМ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В г. МОГИЛЕВЕ

Аукцион состоится 13 декабря 2011 года в 16.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний

№ лота	Адрес земельного участка	Площадь, га	Срок аренды	Цель использования, условия продажи	Кадастровый номер	Стоимость землеустроительного дела (руб.)	Начальная цена (руб.)	Сумма задатка (руб.)
№ 1	улица Габровская	0,2697	50 лет	строительство и обслуживание административно-складской базы	740100000005003822	532 579	105 099 000	9 459 000
№ 2	переулок Гаражный	0,6116	50 лет	строительство и обслуживание станции технического обслуживания автомобилей с автомойкой и магазином сопутствующих товаров	740100000003005963	1 434 695	862 618 000	77 636 000
№ 3	район пересечения Минского шоссе и улицы Пелагеевской (ограничения – р. Дубровенка)	0,2500	50 лет	строительство и обслуживание гостиницы и кафе	740100000001005247	583 397	223 141 000	20 083 000
№ 4	улица Ямницкая (ограничения – охр. зона ЛЭП)	0,0800	50 лет	строительство и обслуживание складских помещений	740100000003005397	1 478 015	38 232 000	3 441 000

Принимать участие в аукционе могут юридические лица, индивидуальные предприниматели и граждане.

При оформлении заявления и соглашения о правах и обязанностях сторон желающие принять участие в аукционе представляют:

Заверенную копию платежного поручения **о внесении задатка (задатков)** на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета **№ 3641017440554** в филиале 700 МОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700123787 (разовый платеж).

Юридические лица: доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица; копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица; документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

Индивидуальные предприниматели: копию свидетельства о государственной регистрации; копию паспорта, а в случае участия в аукционе представителя – копию паспорта и нотариально удостоверенную доверенность.

Граждане – копию паспорта, а в случае участия в аукционе представителя – копию паспорта и нотариально удостоверенную доверенность.

Иностранные юридические лица: легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения, также документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе), либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованными в установленном порядке переводами на белорусский (русский) язык.

Представители иностранного юридического лица или гражданина: легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

Граждане и субъекты хозяйствования, желающие участвовать в аукционе в отношении **нескольких предметов** аукциона, вносят **задатки** в размере, установленном **для каждого из этих предметов аукциона**.

1) Условия инженерного развития инфраструктуры: земельные участки для нового строительства – в соответствии с проектно-сметной документацией.

2) Условие проведения аукциона – наличие не менее двух участников.

3) Порядок осмотра на местности земельных участков: выезд по желанию, предварительное ознакомление с земельно-кадастровой документацией всем желающим.

4) В течение **10 рабочих дней** со дня принятия решения о предоставлении в аренду земельных участков победителям аукциона **оплатить стоимость предмета аукциона, возместить затраты на организацию и проведение аукциона**, в том числе **расходы**, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решениях об изъятии земельных участков для проведения аукциона. Ориентировочная сумма затрат на организацию и проведение аукциона (на всех победителей) составляет 7 миллионов рублей.

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Проектное специализированное бюро») по адресу: **г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206** в рабочие дни с 8.00 до 17.00. **Последний день приема заявлений – 7.12.2011 года до 17.00**.

Контактный телефон в г. Могилеве 22 11 63.

ПРЫГАЖОСЦЬ НА ПАКАЗ

ЛЕПШЫЯ цырульнікі і стылісты, майстры па нейл-дызайну і дэкаратыўнай касметыцы сабраліся на дзясятай, юбілейнай міжнароднай спецыялізаванай выставе індустрыі прыгажосці і здароўя «ІнтэрСтыль-2011» у НВЦ «Белэкспа» (Я.Купалы, 27). Менавіта тут яны паказваюць сваё майстэрства рабіць жанчын (ды і мужчын) самымі прыгожымі і прывабнымі — ствараюць неверагодныя прычоскі, яркі макіяж, цікавыя вобразы... У рамках выставы праходзяць чэмпіянат Беларусі па цырульніцкім майстэрстве, нэйл-дызайне і дэкаратыўнай касметыцы і міжнародны фестываль прыгажосці.

На выставе прадстаўленыя розныя кірункі індустрыі прыгажосці — дэкаратыўная і лекавая касметыка, парфума, аксесуары для салонаў прыгажосці і цырульняў, салярыі — усяго каля пяцідзесяці беларускіх і замежных кампаній. Усіх наведнікаў чакаюць шоу-паказы і майстар-класы, а таксама магчымасць выпрабаваць на сабе навінкі, напрыклад, бясплатна зрабіць манікюр ці пазагараць у салярыі.

Выстава працуе да 4 снежня.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

7 ЦУДАЎ ПРЫРОДЫ

Zамор'е

Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.

Пасля двухгадовага галасавання з удзелам мільёнаў людзей па ўсім свеце быў складзены новы спіс пад інтрыгуючай назвай «7 цудаў прыроды»

Паводле New7Wonders, кампаніі, якая арганізавала гэта міжнароднае спаборніцтва, першапачаткова ў спісе кандыдатаў было каля 440 месцаў, але цяпер адабраны папярэднія сем пераможцаў. Афіцыйныя вынікі будуць абвешчаны на пачатку наступнага года, а пакуль спіс з сямі месцаў, якія атрымалі больш за мільён галасоў, выглядае наступным чынам.

Вадаспады ІГУАСУ, АРГЕНЦІНА

Вадаспады Ігуасу, размешчаныя на аднайменнай рацэ, з'яўляюцца аднымі з найбуйнейшых вадаспадаў у свеце. Яны распасціраюцца больш чым на 2700 метраў у даўжыню і ствараюць рад паўкруглай формы. З 275 асобных вадаспадаў, якія разам і складаюць вадаспады Ігуасу, самым высокім з'яўляецца «Горла Д'ябла». Вада тут падае з вышыні каля 80 метраў. Гэты цуд свету размешчаны на мяжы бразільскага штата Парана і аргенцінскай правінцыі Місьёнес і акружаны двума нацыянальнымі паркамі. Абодва паркі — гэта субтрапічныя лясы, якія з'яўляюцца домам для сотняў рэдкіх і знікальных відаў раслін і жывёл.

Чэджу — востраў вулканічнага паходжання, які ўзнік каля 2 млн гадоў таму. Плошча, якую займае востраў, складае 1845 кв. км. На востраве размешчаны вулкан Халасан, які з'яўляецца самай высокай кропкай краіны (1950 м). Халасан акружаны 360 невялікімі вулканамі-спадарожнікамі. Чэджу вядомы разгалінаванай сістэмай лававых труб (пячор), створаных падчас вывяржэння вулкана 100—300 тыс. гадоў таму. Тэмпература ў пячорах каля 11—21°С. Тунэлі Чэджу-до ўпрыгожаны натуральнымі каменнымі сталактытамі і калонамі. У кальдэры вулкана размешчана адзінае натуральнае возера ў краіне. Прысутнічаюць вадаспады. Клімат пераважна субтрапічны. Востраў Чэджу з'яўляецца аб'ектам сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

АМАЗОНКА і Амазонскія джунглі

Трапічныя лясы Амазонкі, таксама вядомыя як Амазонія, Амазонка ці джунглі басейна Амазонкі, складаюцца з 7 мільёнаў квадратных кіламетраў непраходных джунгляў, якія раскінуліся на тэрыторыі дзевяці краін. Па сваёй тэрыторыі Амазонія — гэта больш за палову з усіх трапічных лясоў, якія засталіся на планеце. Гэтае месца з'яўляецца адным з найбольш багатых на флору і фаўну.

Востраў ЧЭДЖУ, ПАЎДНЁВАЯ КАРЭЯ

Востраў Чэджу-до (ці Чэджу) тэрытарыяльна размешчаны ў Карэйскім праліве за 130 кіламетраў ад узбярэжжа Рэспублікі Карэя.

Падземная рака ПУЭРТА-ПРЫНЦЭСА, ФІЛІПІНЫ

Падземныя рэкі Пуэрта-Прынцэса і аднайменны нацыянальны парк размешчаны

прыкладна за 50 кіламетраў ад горада Пуэрта-Прынцэса на Філіпінах. Адметнасцю гэтага месца з'яўляецца гара з падземнай ракой даўжынёй 8,2 кіламетра. Прычым па выхадзе з гары адразу ўпадае ў Паўднёва-Кітайскае мора. Раку-пячору ўпрыгожваюць шматлікія сталактыты і сталагміты, а таксама некалькі вялікіх гротаў. Гэта самая доўгая падземная рака ў свеце. Вусце пячоры аздоблена старажытнымі дрэвамі, якія растуць тут жа, у вадзе, а пляж каля ўвахода ў пячору дае прыстанак розным жывёлам.

Нацыянальны парк КАМОДА, ІНДАНЕЗІЯ

Нацыянальны парк Камода тэрытарыяльна размешчаны паміж астравамі Флорэс і Сумбава, Інданезія. Парк уключае тры астравы: Камода, Рынка, Падар і некалькі дробных астраўкоў. Агульная плошча — 75 тыс. гектараў. На тэрыторыі парку разнастайная флора і фаўна. Уключаючы камодскага варана (дракон Камода) — самай буйной яшчаркі на Зямлі. Нацыянальны парк Камода ўключаны ў спіс аб'ектаў сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

Бухта ХАЛОНГ, В'ЕТНАМ

Заліў Халонг размешчаны на ўзбярэжжы Паўднёва-Кітайскага мора (В'етнам). Халонг вядомы тым, што па заліве раскідана мноства астраўкоў (яны складаюцца з вапняку) розных памераў і формаў (уключаючы «скульптурныя»). Налічваецца

іх каля 2000. Халонг азначае «заліў драконаў, якія спускаюцца». Таксама ў заліве можна сустрэць пячоры і гроты і палюбавацца сталактытамі і сталагмітамі. Заліў Халонг таксама занесены ў спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

Сталовая гара, ПАЎДНЁВАЯ АФРЫКА

Сталовая гара, ці Тафельберг, размешчана на ўзбярэжжы Сталовай бухты недалёка ад Кейптаўна, ПАР. Сталовая гара ўзвышаецца на 1086 метраў над узроўнем мора. Яна мае вертыкальныя схілы і плоскую вяршыню (адкуль і назва гары). Гара складаецца з некалькіх участкаў: гэта плоскае плато Сталовай гары, пік Д'ябла, пік Дванаццаці Апосталаў, пік Ільвінай галавы. З'яўляючыся выбітнасцю Кейптаўна, Сталовая гара прыцягвае турыстаў з усяго свету. На гару магчымы ўздым з дапамогай канатнай дарогі.

ХОЗЯЙСТВЕННЫЙ СУД ГОРОДА МИНСКА

ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО НА ПРАВЕ ХОЗЯЙСТВЕННОГО ВЕДЕНИЯ ГОСУДАРСТВЕННОМУ ТОРГОВО-ПРОИЗВОДСТВЕННОМУ ОБЪЕДИНЕНИЮ «БЕЛРЕСУРСЫ»

Лот № 1. Цех по переработке мяса, инвентарный номер № 620/С-22976 (с пристройкой), общей площадью 1246,1 м² (одноэтажное панельное здание с блочной пристройкой), подъездная асфальтированная дорога (863 м²), ограждение из бетонных плит (124 метра), расположенные по адресу: Минская область, Дзержинский район, Боровской с/с, д. Журавинка, стоимостью 1 010 956 800 (Один миллиард десять миллионов девятьсот пятьдесят шесть тысяч восемьсот) белорусских рублей. Арендуется до ноября 2013 года под производство пенобетонных блоков.

Стоимость имущества указана с учетом НДС.

Минимальная величина первого шага составляет 5% от стоимости реализуемого с торгов имущества.

Подробная информация об имуществе размещена на сайте: http://minsk.court.by/ а также в помещении хозяйственного суда г. Минска: г. Минск, ул. Академическая, 15/1.

Торги состоятся 22.12.2011 года в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Академическая, 15/1, каб. 201.

За дополнительной информацией обращаться: судебный исполнитель Сидорок И.В., тел./факс: 294 93 29 (86), 8 029 177 32 61 (54), ст. судебный исполнитель Вярьвильский Д.А., тел. 294 93 67.

Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть перечислен на депозитный счет № 3642900000072 в ОАО «АСБ Беларусбанк» Минск, код 795, УНП 101541763 хозяйственного суда города Минска не позднее чем за 24 часа до начала проведения торгов.

В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 г. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

ХОЗЯЙСТВЕННЫЙ СУД ГОРОДА МИНСКА

ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО ОАО «ЗАВОД «ЭЛЕКТРОНИКА»

Лот № 1. Единый объект недвижимого имущества в составе недвижимого улучшения (насосная, административные и вспомогательные помещения с инвентарным № 500/С-41362, назначение — здание специализированное энергетики, общей площадью 632,2 кв. м) и условного земельного участка площадью 374 кв. м, выделенного на праве постоянного пользования. Адрес объекта: г. Минск, ул. Корженевского, д. 14, корп. 4. Стоимость: 2 287 918 000 рублей.

Минимальная величина первого шага составляет 5% от стоимости реализуемого с торгов имущества.

Подробная информация об имуществе размещена на сайте: http://minsk.court.by/, а также в помещении хозяйственного суда г. Минска.

Торги состоятся 22.12.2011 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Академическая, 15/1, каб. 201.

За дополнительной информацией обращаться: старший судебный исполнитель Вярьвильский Д.А., тел. 294 93 67.

Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть перечислен на депозитный счет № 3642900000072 в ОАО «АСБ Беларусбанк» Минск, код 795, УНП 101541763 хозяйственного суда города Минска не позднее чем за 24 часа до начала проведения торгов.

В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 г. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.06	16.52	7.46
Віцебск —	9.02	16.34	7.32
Магілёў —	8.56	16.41	7.45
Гомель —	8.44	16.46	8.02
Гродна —	9.20	17.08	7.48
Брэст —	9.12	17.17	8.05

Месяц

Першая квадра ў 11.53. Месяц у сузор'і Рыбаў.

Імяніны

Пр. *Аляксандра, Валянціна, Васіля, Дзмітрыя, Івана, Ігната, Канстанціна, Міхаіла, Сяргея.*

К. *Альбіны, Паўліны, Пятра, Рафала, Яна.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НАДВОР'Е на заўтра

Дзве даты

2 снежня

Міжнародны дзень за адмену рабства. Адзначаецца па рашэнні Генеральнай Асамблеі ААН у дзень прыняцця 4-й сесіяй Генеральнай Асамблеі ААН (2 снежня 1949 г.) Канвенцыі аб барацьбе з гандлем людзьмі.

1902 год — нарадзіўся (ст. Пухавічы Ігуменскага павета) Анатоль Вольны (Анатоль Іўсцінавіч Ажгірэй), беларускі паэт, празаік, кінадраматург. З сям'і службоўца. Вучыўся ў Ігуменскай гімназіі. У 1920 годзе пайшоў добраахвотнікам у Чырвоную армію. Пасля дэмабілізацыі ў 1921 годзе працаваў у ЦК ЛКСМБ, у газеце «Малады араты». Вучыўся ў БДУ. Публікаваўся з 1921 года.Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі. Адзін з заснавальнікаў літаратурнай арганізацыі «Маладняк». Аўтар прыгодніцкай аповесці «Два», аповесці «Антон Савіцкі», кнігі фельетонаў «Суседзі». Па сцэнарыях Анатоля Вольнага пастаўленыя фільмы «Новая радзіма», «Сонечны паход», «Шасцідзясятая паралель», «Хвоі гамоняць», «Атэль «Савой» і інш. У 1936 г. быў арыштаваны як «член контррэвалюцыйнай арганізацыі» і асуджаны да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Анатоль Вольны быў расстраляны ў «чорную ноч» беларускай літаратуры, 29 кастрычніка 1937 года, разам са сваім сябрам Алесем Дударам і двума дзясяткамі іншых патэнцыйных класікаў. Дзе іх магіла — да гэтага часу невядома. Рэабілітаваны пасмяротна ў 1957 годзе.

1927 год — адкрыўся XV з'езд партыі, які прыняў рашэнне калектывізаваць сельскую гаспадарку. Па прызнанні самога Сталіна — у размове з Чэрчылем на Ялцінскай канферэнцыі — калектывізацыя забрала да дзесяці мільёнаў чалавечых жыццяў. Ну а тады, у 1927-м, на другі дзень з'езда, Сталін выступіў з дакладам, у якім казаў пра «найглыбейшы крызіс і няўстойлівасць сусветнага капіталізму» і пра тое, што «савецкая ўлада з'яўляецца самай трывалай уладай з усіх існуючых у свеце ўладаў». На з'ездзе адбыўся таксама разгром трацкісцкай «левай апазіцыі» — яна перастала існаваць, Троцкага неўзабаве выслалі ў Алма-Ату, а потым выгналі за мяжу. У новы склад Палітбюро былі абраныя дзевяць чалавек. Лёс пяцярых з іх аказаўся ў далейшым трагічным: Куйбышаў памёр пры падазроных абставінах, Томскі пакончыў з сабой, Рудзутак, Бухарын і Рыкаў былі расстраляныя. Выжылі толькі Сталін, Молатаў, Калінін і Варашылаў. Дарэчы, Варашылаў памёр сваёй смерцю. Здарылася гэта ў дату нашага агляду — 2 снежня 1969 года.

Цытата дня:

«Поспех — кепскі настаўнік. Ён кружыць галаву. Ён ненадзейны. Бізнэс-план або найноўшая тэхналогія — верх дасканаласці сёння, заўтра могуць гэтак жа безнадзейна састарэць, як васьмідарожкавыя магнітафоны або тэлевізары на электронных лямпах. Я пільна сачыў за тым, як гэта адбывалася. Доўгае і ўважлівае назіранне за мноствам кампаній дапамагло ўзняць нядрэнныя ўрокі, навучыла, як планаваць на гады наперад».

Біл Гейтс (Уільям Генры Гейтс III) — амерыканскі праграміст і бізнэсмен.

Усміхнемся

Вырашыла пасля шасці не есці... Пайду пап'ю супу!

☺

У краме.

— У вас ёсць тэлевізар з фільтрам глупства?

— Так, блін, узялі адзін на спробу. Вунь, стаіць у кутку і ўключаецца раз на тыдзень, сволач!

☺

Кожнага з нас вучылі, што існуе тры тыпы кутоў: прамыя, тупыя і вострыя. Калі я падрос і ў мяне з'явілася ўласная хата, пры першым жа абклейванні шпалер я даведаўся, што яшчэ існуе чацвёрты тып кутоў — крывыя. І такіх у прыродзе больш за ўсё.

☺

У аптэцы.

— Можна пачак прэзерватываў?

— Не.

— Чаму?

— Год сям'і!

☺

Праверана: калі паклікаць дзяўчыну, якая стаіць, павярнуўшыся да вас спінай — «Гэй, прыгажуня!» — абарочваюцца нават бабулькі.

☺

Сямейная сварка ўвечары пасля працоўнага дня. Муж:

— Ты стала прыходзіць апошнім часам з працы выпіўшы!

Жонка:

— Ты на сябе паглядзі — кожны дзень сам п'яны!

Муж:

— Я з мужыкамі выпіваю!

Жонка:

— А Я З КІМ?!

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І.БАРАНОЎСКІ, У.ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н.КАРПЕНКА, Л.ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, Л.РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л.СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, В. ПАЗНЯКОЎ.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 5759. Нумар падпісаны ў 19.30 1 снежня 2011 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12